Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Кам. КП(б)Б

ЛІПЕНЬ 13 1932 г. № 155 (4407). Год выданьня XV.

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АБ ПРАКТЫЧНЫХ МЕРАПРЫ�ЕМСТВАХ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ ПАСТАНОЎ ЦК УсеКП(б) АБ САВЕЦКІМ ГАНДЛІ І ШЫРОСПАЖЫВЕ Пастанова аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б (2 стар.).

АБ ВЫНІКАХ ЛІПЕНЬСКАГА ПЛЕНУМУ ЦК і ЦКК КП(б)Б — Рэзалюцыя нашыранага пленуму Менскага гаркому КП(б)Б разам з партактывам гарпартарганізацыі па дакладу тав. Шаранговіча (3 стар.).

ОРДЭН ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЬЦЯГУ ГЕРОЯМ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ І САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ БУДОЎЛІ — Пастанова прэзыдыуму ЦВК БССР (4 стар.).

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Пастановы ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б — у масы. Л. АСТРАВЕР — Дзень прараба Валаховіча (2 стар.).

Ушчыльненьнем тэрмінаў касьбы забясьпечым уборку сена бяз страт (1 стар.).

Адзіны шлях да сацыяльнага і нацыянальнага вызваленьня — шлях пралетараў БССР — з адозвы былых паслоў польскага сойму — грамадаўцаў: Мятлы, Рак-Міхайлоўскага і сакратара Грамады — Бурсэвіча (4 стар.).

Гераічная барацьба бельгійскіх гарнякоў (4 стар.).

Японскія інтэрвэнты гавораць адкрыта аб ваенных плянах (4 стар.).

ПАСТАНОВЫ ЛІПЕНЬСКАГА ПЛЕНУМУ ЦК І ЦКК КП(б)Б—У МАСЫ

Ліпеньскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б, пастановы якога мы з сёньняшняга дня пачынаем зьмяшчаць, праводзіў свае работы ў той момант, калі краіна пралетарскай дыктатуры, пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі і яе ленінскага ЦК УсеКП(б), на чале з тав. **Сталіным**, атрымала яшчэ адну буйную перамогу ў барацьбе за сацыялізм — з посьпехам закончыла трэцюю бальшавіцкую сяўбу.

Саўгасы і калгасы Савецкага саюзу засеялі ў гэтым годзе амаль на 10 млн. га больш, чым у мінулым. Чатыры пятых пасеўнай плошчы ўсяго яравога кліну СССР — у руках саўгасаў і калгасаў. Гэта бліскуча пацьвярджае, што Савецкі саюз канчаткова ўмацаваўся па новым сацыялістычным шляху. Гэта новы бліскучы, вялікай сілы факт, які гаворыць, што наперакор апартуністам усіх колераў генэральная лінія партыі перамагла, што толькі яе выразнае ажыцьцяўленьне забясьпечвае няўхільны рух наперад па шляху да сацыялізму.

Цэнтральны камітэт КП(б)Б, на чале з тав. **Гікало**, у барацьбе за ажыцьцяўленьне асноўных задач партыі, у барацьбе за бальшавіцкую сяўбу паказаў сапраўдныя **ўзоры бальшавіцкага стылю работы, канкрэтнасьці і апэрацыйнасьці кіраўніцтва.** Гэта пацьверджана тымі новымі посьпехамі, якіх дабілася БССР за апошні пэрыяд на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва і ў першую чаргу на фронце веснавой сяўбы. Гэта бліскуча пацьверджана і работамі ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК.

Пленум ЦК і ЦКК, узяўшы вузлавыя пытаньні данага этапу сацыялістычнага будаўніцтва ў іх узаемнай сувязі, паставіў перад партыйнымі арганізацыямі надзвычай складаныя і вялікія задачы, вызначыў суму канкрэтных мерапрыемстваў.

Першае пытаньне, абмеркаванае пленумам,—гэта **вынікі веснавой сяўбы і задачы ўборачнай кампаніі.** Пленум даў глыбокі і ўсебаковы аналіз тым зрухам, якія адбыліся ў трэцюю бальшавіцкую вясну. Гэтыя зрухі ў асноўным зводзяцца да таго, што сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі БССР у гэтым годзе засеяў значна большую плошчу, чым летась. У вогуле пасеўны плян бягучага году выканан у 2.326 тыс. га, супроць леташняга пляну ў 2.543 тыс. Павялічэньне такім чынам атрымліваецца на 217 тыс. га, або 9,3 проц.

У наяўнасьці далейшы рост і ўмацаваньне сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі, пасеўная плошча якога пад яравым клінам раўняецца 60,6 проц. Веснавая сяўба яшчэ больш умацавала калгасы арганізацыйна-гаспадарча і палітычна.

Пленум, адзначаючы новыя перамогі па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, даў разгорнутую крытыку і тым недахопам, якія выяўлены ў часе веснавой сяўбы. Асноўныя з гэтых недахопаў заключаюцца ў наступным: не заўсёды было досыць выразнае апэрацыйнае кіраўніцтва ходам падрыхтоўкі да сяўбы з боку цэнтральных і раённых арганізацый, зямельных і калгасных органаў. Дрэнна было пастаўлена плянаваньне і ўлік. У радзе месц назіралася нездавальняючая расстаноўка сіл, была слабая дысцыпліна. У часе сяўбы нездавальняюча была разгорнута масава-палітычная работа. Слаба праводзілася барацьба за павышэньне ўраджайнасьці і г. д.

На аснове гэтага глыбокага аналізу пленум высунуў вялікай палітычнай і гаспадарчай важнасьці задачы па праполцы і ўборцы ўраджаю, па ворыве папару і правядзеньні асеньняй сяўбы. Устанавіўшы тэрмін і заданьні па асноўных сельска-гаспадарчых работах, пленум асаблівую ўвагу партыйных, савецкіх і калгасных арганізацый зьвярнуў на **пытаньне барацьбы са стратамі пры ўборцы ўраджаю, на пытаньні арганізацыі працы** (умацаваньне брыгады, як асноўнага зьвяна, кадры брыгадзіраў, стымуляваньне росту прадукцыйнасьці працы і г. д.), на пытаньні выдачы авансаў калгасьнікам у лік натуральнай часткі прыбыткаў, на канкрэтнасьць і апэрацыйнасьць кіраўніцтва.

Асабліва трэба падкрэсьліць, што пытаньні разьмеркаваньня ўраджаю набываюць выключна важнае значэньне.

Цалкам прыстасоўваючы асноўны прынцып у адносінах да лодыраў, рвачоў, прагульшчыкаў і ўсіх тых, хто ня хоча працаваць, а хоча больш сарваць — хто не працуе, той і ня есьць, — партэрганізацыі ўсю сваю работу па разьмеркаваньні ўраджаю і па выдачы авансаў павінны праводзіць пад кутом гледжаньня—хто больш і лепш працуе, той больш і атрымлівае. Трэба даць зьнішчальны адпор спробам праевсы ці кулацкую ўраўнілаўку.

Усе тыя задачы і канкрэтныя мерапрыемствы, якія высунуты ў пастанове ЦК, у сваёй агульнай складанасьці прадстаўляюць сабою **разгорнутую праграму барацьбы за новыя перамогі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.**

Другое пытаньне — **аб практычных мерапрыемствах па разгортваньні савецкага гандлю і вырабе тавараў шырокага спажываньня.** Прайшло два месяцы з часу апублікаваньня гістарычных пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб збожжа і жывёлазагатоўках, аб разгортваньні калгаснага гандлю. На гэтыя пастановы партыі і ўраду калгасьнікі адказалі канкрэтнай справай. Яны ўмацнілі вываз сельска-гаспадарчых прадуктаў на рынак. Вызначыўся працэс зьніжэньня цэн на с.-г. прадукты.

Адзначаючы гэтыя першыя посьпехі ў разгортваньні калгаснага гандлю і гандлю с.-г. прадуктамі, пленум з усёй рашучасьцю падкрэсьліў, што рэалізацыя дырэктыў партыі па гэтым пытаньні праходзіць нездавальняюча. Некаторыя раённыя партарганізацыі не разгарнулі палітычна-масавай работы, не надышлі яшчэ канкрэтна да правядзеньня мерапрыемстваў, накіраваных па разгортваньне гандлю с.-г. прадуктамі. У некаторых раёнах мелі месца факты проста-га скажэньня асноўных прынцыпаў у разгортваньні савецкага гандлю.

Асабліва пленум падкрэсьліў маруднае разгортваньне вырабу прадметаў шырокага спажываньня, якімі трэба сустрэць прыцёк сельска-гаспадарчых прадуктаў на рынак. Пленумам катэгарычна асуджаны пагардлівыя адносіны, праяўленыя асобнымі гаспадарнікамі да такой адказнейшай задачы, як выраб прадметаў шырокага спажываньня. Адначасова падкрэсьлена, што гандлёва-каапэрацыйныя аб'яднаньні яшчэ не навучыліся хутка прасоўваць тавары і прадметы шырокага спажываньня ў саўгасы і калгасы, у масы калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў.

Таму пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б абавязаў дзяржаўную і мясцовую прамысловасьць, а таксама прамкаапэрацыю шырока разгарнуць выраб прадметаў гаспадарчага ўжытку. Дадатковая праграма па вырабе прадметаў шырокага спажываньня ў другім паўгодзьдзі на суму 30.605.480 руб. павінна быць выканана. Змагацца за выкананьне і перавыкананьне гэтай праграмы — справа гонару кожнага камуніста і рабочага нашай прамысловасьці.

Прасоўваньне прамтавараў і прадметаў шырокага спажываньня на вёску патрабуе ад гандлёвых арганізацый ўзмацненьня сваёй работы, наданьня ёй большай гібкасьці і шырэйшага размаху. Перад каапэрацыйнымі арганізацыямі пленум паставіў цэлы рад адказнейшых задач і пастанавіў мабілізаваць каля 500 камуністаў для работы ў сельскіх спажывецкіх таварыствах.

Пастанова пленуму аб разгортваньні калгаснага гандлю і вырабе прадметаў шырока га спажываньня можа быць выканана толькі пры ўмове бязьлітаснай барацьбы на два фронты, супроць правых і «левых» апартуністаў, супроць ўсялякіх скажэньняў лініі партыі ў савецкім гандлі, у разгортваньні таваразвароту.

Перабудова і разгортваньне арганізацыйнай партыйна - выхаваўчай і масавай работы зьяўляецца ключом да пасьпяховага вырашэньня тых задач, якія на даным этапе ставіць партыя.

КП(б)Б, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, за апошнія гады надзвычай вырасла і павысіла ідэйна - палітычны ўзровень сваіх членаў. КП(б)Б асабліва з часу свайго XIV зьезду дабілася значных посьпехаў у перабудове сваёй работы ў перапясеньні яе цэнтру цяжару ў нізавое вытворчае зьвяно. Партыйныя арганізацыі на аснове барацьбы супроць правых апартуністаў і «левакоў» яшчэ больш загартавалі свае рады і згуртаваліся вакол ленінскага ЦК УсеКП(б) і правадыра партыі тав. **Сталіна.**

Партыйныя арганізацыі і ў першую чаргу буйнейшых вытворчых цэнтраў на аснове арганізацыйнай перабудовы сваіх радоў (стварэньне партыйных груп, забесьпячэньне партыйным уплывам і кіраўніцтвам вядучых вучасткаў вытворчасьці і г. д.) наблізілі сваю работу да рабочых мас.

Значна ўмацаваліся і вясковыя партарганізацыі. Вясковыя парт'ячэйкі ў барацьбе за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, супроць кулацтва вырасьлі, узмацнілі сваю работу і павысілі ідэйна-палітычны ўзровень.

Гэта ўсё зьяўляецца бясспрэчным фактам, які знаходзіць сваё пацьвярджэньне на кожным вучастку сацыялістычнага будаўніцтва.

Але тыя задачы, якія пастаўлены партыяй на даным этапе, патрабуюць уздыму на яшчэ вышэйшую ступень работы партыйных арганізацый, асабліва ў галіне разгортваньня арганізацыйнай партыйна-выхаваўчай, масава - палітычнай і агітацыйнай працы.

Выходзячы з гэтага, пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б паставіў адказнейшыя задачы перад партыйнымі арганізацыямі. Асаблівую ўвагу пленум зьвярнуў на ўмацаваньне сярэдняга зьвяна, на падрыхтоўку і перападрыхтоўку кадраў кіруючых партработнікаў, на павышэньне зьместу работы ячэек. Гэтыя пытаньні ў сыстэме арганізацыйнай работы зьяўляюцца першараднымі і таму павінны атрымаць неадкладнае практычнае праламленьне ў рабоце кожнай арганізацыі.

Падкрэсьліваючы, што ў некаторых партарганізацыях слаба разгорнута партыйна - выхаваўчая работа, пленум абавязаў партыйныя ячэйкі, калектывы і партарганізацыі рашуча ўзмацніць выхаваньне членаў і кандыдатаў партыі, асабліва тых, якія нядаўна ўступілі ў папы рады.

Задача кожнай партарганізацыі ахапіць масава - палітычнай работай кожнага рабочага, разьвіць палітычную агітацыю сярод шырокіх мас калгасьнікаў.

Пленум ЦК і ЦКК сваімі работамі і зьместам пастаноў паказаў узор, як трэба браць вузлавыя пытаньні, як іх трэба вырашаць, паказаў узоры разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі. **Пастановы пленуму гэта — праграма бальшавіцкіх дзеяньняў для ўсіх арганізацый КП(б)Б.**

Задача заключаецца ў тым, каб пастановы пленуму давесьці да кожнага камуніста ў горадзе і на вёсцы, да кожнага рабочага і калгасьніка, да шырокіх мас працоўных. На адкрытых сходах ячэек, на спэцыяльна прысьвечаных сходах у цэхах, брыгадах, інтэрнатах, хатах-чытальнях і чырвоных куткох трэба шырока прапрацаваць гэтыя пастановы. Кожны камуніст на толькі павінен глыбока ведаць пастановы пленуму сам, а і ў сваёй штодзённай рабоце павінен узброіваць імі шырокія масы калгасьнікаў.

Узброіўшыся пастановамі пленуму, шырока папулярызуючы іх у масах, яшчэ шырэй разгортваючы барацьбу супроць правых і «левых» апартуністаў і прыміраючаў да ўхілаў ад бальшавізму, партыйныя арганізацыі, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, дабіваюцца новых посьпехаў у барацьбе за поўную перамогу сацыялізму.

Ушчыльненьнем тэрмінаў касьбы—забясьпечым уборку сена бяз страт

„Трава ня вырасла, касіць рана"...

БАРЫСАЎ. (Наш. кар.). Надвор'е ў гэтым годзе вельмі спрыяе сенаўборцы. Касьба, сушка і стагаваньне сена, або звозка ў гумны не сустракае ніякіх перашкод. Ня гледзячы на выключна спрыяючыя ўмовы, рад калгасаў раёну, як «**Чырвоная метча**», «**Перамога**», «**Хваля рэвалюцыі**» і інш. яшчэ не пачыналі касіць.

«Трава ня вырасла, касіць рана»—вось звычайны адказ апартуністаў, якія прабуюць адцягнуць сенаўборку.

Уборку заліўных сенажацяй, паводле дырэктывы Наркамзему, трэба скончыць не пазьней 10 ліпеня, а сухадольных—25 ліпеня. У Барысаўскім раёне на 5-ае ліпеня было ўбрана ўсяго каля 2 проц. сенажаці. Калгасы «**Праўда**», «**Шлях сацыялізму**» і інш. зьбіраюцца расьцягнуць сенаўборку па 2 месяцы. Некаторыя калгасы, як «**Камсамолец**» пачынаюць здаваць сенажаць «на часьць» аднаасобнікам.

У калгасах, якія абслугоўваюцца МТС, ня складзены рабочыя пляны сенаўборкі.

Ход сенаўборкі ў бліжэйшую дэкаду вырашае посьпех забесьпячэньня жывёлы кармамі на зіму. Апартуністычная практыка на сенажацях, усякія спробы адцягнуць касьбу павінны сустрэць самы жорсткі адпор.

СЕНА НАКЛАДАЮЦЬ НА ВОЗ

(Калгас «Пяцігодка ў чатыры гады» Менскага раёну)

Прыцягнуць да адказнасьці вінаватых у патраве 1.000 га сенажаці

Пры разьмеркаваньні сенажацяй паміж 3 саўгасамі раёну—«**Стрэлічава**», «**Судкова**» і «**Барысаўшчына**», Хойніцкая райземчастка мала задумалася над сутнасьцю справы. Ня прымалі ў разьлік ні колькасьці жывёлы таго ці іншага саўгасу, ні патрэбнасьці ў кармох.

Ткнулі пальцам і гатова... вучастак адведзен.

На справе-ж атрымалася вось што: саўгасу «**Барысаўшчына**», які мае 368 шт. рагатай жывёлы (у пераводзе на дарослую) адвялі 1.243 га сенажаці, саўгасу «**Судкова**», які мае 383 шт., адвялі 900 га, а саўгасу «**Стрэлічава**», дзе стада складае 352 шт., адвялі 420 га.

Як бачым, стада ва ўсіх трох гаспадарках амаль аднолькавае, а сенажаці атрыманы розныя кавалкі. Па-рознаму пачалі і ўборку.

Саўгас «Барысаўшчына», каб хутчэй «убраць» сенажаць (а плошча не малая — 1.243 га) пабудаваў там часовыя загоны і пусьціў жывёлу на пашу. **Так стравілі 450-500 га каштоўнейшай сенажаці.** Гэты прыклад пераняў і саўгас «**Судкова**», які таксама пусьціў на сенажаць жывёлу і стравіў каля 150 га. Не адсталі і аднаасобнікі вёскі **Гноеў, якія стравілі да 300 га.**

Дзе-ж быў райза і сельсавет?

Райза і Барысаўшчанскі сельсавет моўчкі пазіралі на гэта агіднейшае разбазарваньне тысячы га сенажаці.

Трэба дадаць, што жывёла саўгасаў «Барысаўшчыны» і «Судкова» ходзіць там, дзе ў гэтым годзе сялянамі-аднаасобнікамі раскарчавана цаліна і засеяна проса.

Усе гэтыя факты пацьвердзіліся пры абсьледваньні справы спэцыяльнай камісіяй. Загадчык райза тав. Кольнічэнка — аўтар «разумнага» разьмеркаваньня, абараняючы гонар свайго мундзіру, ня хоча прызнаць сваёй памылкі.

На заўвагі камісіі, што рабіць выган на сенажаці недапушчальна, Кольнічэнка ў адміністрацыйным запале адказвае: «Гэты фонд нам вызначыў Наркамзем і аднаасобнікаў з іх полем мы адсюль выганім, забаронім сеяць і зробім выган».

Мы патрабуем ад пракуратуры прыцягнуць да адказнасьці вінаватых у патраве тысячы га сенажаці і пасеваў аднаасобнікаў.

Гардзейчык, Кучаравы, Турскі.

Рацыяналізатарскія прапановы калгасьнікаў забясьпечылі выкананьне поліва

ЧАЧЭРСК. Зараз-жа пасьля скапчэньня сяўбы позьніх яравых (грэчкі і інш. культур) калгас **імя Леніна** ўсю рабочую сілу пераключыў на правядзеньне праполкі і падрыхтоўку да ўборкі. Поліва праходзіць на аснове правільнай арганізацыі працы, правільнай расстаноўкі сіл. Партыйная ячэйка праводзіцца масава-растлумачальная работа ў брыгадах. Брыгады забясьпечаны штодзённым апэрацыйным кіраўніцтвам як з боку партыйнай ячэйкі, так і праўленьня калгасу. Усё гэта дало магчымасьць калгасу зьнішчыць ранейшае адставаньне і выйсьці ў рады перадавікоў.

На сёньняшні дзень першае поліва скончана, па некаторых культурах распачата другое. Усяго праполата 52 га ільну, 200 га бульбы, 8 га гароду і 7 га проса.

Значную ролю ў пасьпяховым правядзеньні поліва адыгралі рацыяналізатарскія прапановы некаторых калгасьнікаў. Па рацыяналізатарскай прапанове, унесенай садоўнікам т. Хрысьцінавым М. О., зроблена праполачная машына, якая замяняе ад 30 да 35 чалавек. Машына поле ўсе віды культур і дае значна лепшую якасьць, чым ручное поліва.

Вынаходка тав. Хрысьцінава шырока абмяркоўваецца на брыгадных і калгасных сходах. Створана спэцыяльная камісія для вывучэньня гэтай машыны і пашырэньня яе ў іншыя калгасы. **Ладуцька.**

Дзеляць сена па прынцыпах кулацкай ураўнілаўкі

КАПЫЛЬ. Калгас «**Чырвоны партызан**», Ляшнянскага сельсавету, у мінулым годзе разьмеркаваў кармы па прынцыпу кулацкай ўраўнілаўкі — на кароў. У гэтым годзе таксама тыя-ж самыя памылачкі паўтараюцца. Яшчэ добра не разгарнуўшы сенаўборкі, праўленьне калгасу, разам з упаўнаважаным РВК т. **Мяляўка**, пастанавіла завесьці на кожную неаграмаджаную карову па 100 пуд. сена, незалежна ад таго, колькі той ці іншы калгасьнік зарабіў працадзён.

Гэтай галавацяпскай пастановай праўленьне калгасу зноў стала на шлях кулацкай ураўнілаўкі і яўна сказіла дырэктывы партыі і ўраду аб разьмеркаваньні даходаў у калгасах.

Райкалгассаюз павінен тэрміпова выправіць дапушчаныя праўленьнем калгасу памылкі, павінен дабіцца таго, каб усе даходы калгасу разьмяркоўваліся выключна па колькасьці і якасьці працы, па колькасьці выпрацаваных працадзён. **В.**

Апошнія весткі з фронту сенауборкі

ШКЛОЎ. Калгас імя Дзяржынскага, Славінскага сельсавету, першым у раёне скончыў сенаўборку. Убрана 30 га. **Мядзьведзеў.**

***

ПЯТРЫКОЎ. Перадавы саўгас «Калініна» 24 чэрвеня першым у раёне прыступіў да сенаўборкі. На 8 ліпеня скошана сенажаці 150 га і ўбрана 100 га. Скошана і ўбрана 15 га канюшыны. Уборка праходзіць ударнымі тэмпамі. **Мялешка.**

СЕНАКОС

(Калгас «Пяцігодка ў чатыры гады» Менскага раёну).

3-я СЭСІЯ ЦВК БССР X СКЛІКАНЬНЯ

Няўхільна павялічваць фонды тавараў шырокага спажываньня

З дакладу наркома лёгкай прамысловасьці БССР тав. ГРЫСЕВІЧА

Партыя і ўрад, — кажа тав. **Грысевіч**, —надзвычай многа ўвагі аддавалі і асабліва зараз аддаюць паляпшэньню снабжэньня рабочых і працоўных мас прадметамі шырокага спажываньня. У сувязі з гістарычнымі пастановамі ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб разгортваньні калгаснага гандлю, гэта пытаньне набывае асаблівае значэньне. Насустрач патоку сельска-гаспадарчых прадуктаў з вёскі ў горад трэба накіраваць паток прамысловых тавараў шырокага спажываньня.

Асноўнае—у перабудове работы

Прадукцыя лёгкай прамысловасьці ў асноўнай сваёй масе ідзе на шырокі рынак. Таму перад лёгкай прамысловасьцю зараз стаіць вялізарная задача максымальна павялічыць выраб тавараў. Уся прамысловасьць, якую плянуе Наркамлёгпрам, за 1-ю палову 1932 году, паводле папярэдніх даных, выканала праграму на 94 проц. Калі ўзяць асобныя галіны, дык там, дзе прадпрыемствы сапраўды па-баявому змагаюцца за выкананьне прамфінпляну, добра ажыцьцяўляюць гістарычныя ўказаньні правадыра нашай партыі тав. **Сталіна,**—там мы маем станоўчыя вынікі работы. Вось, напрыклад, **гарбарня «Бальшавік».** Яна надзвычай добра ажыцьцяўляе сваю праграму. Есьць рад швэйных і запалкавых прадпрыемстваў, якія таксама паказваюць узоры ўдарнай работы.

Наркамат лёгкай прамысловасьці, абгаварыўшы пытаньне аб прадпрыемствах, якія поўнасьцю выканалі свае прамфінпляны за першую палову году, пастанавіў прэміяваць лепшых ударнікаў, лепшых змагароў на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Аднак, побач з гэтым ёсьць цэлы рад прадпрыемстваў лёгкай індустрыі, якія ганебна адстаюць. Возьмем швэйную фабрыку «Сьцяг індустрыялізацыі», якая пабудавана ў першыя гады пяцігодкі і абсталявана паводле апошняга слова тэхнікі. Яна з месяца ў месяц, з кварталу ў квартал ня выконвала сваёй праграмы. Чаму? Таму, што былое кіраўніцтва гэтага прадпрыемства не аддавала належнай увагі арганізацыі працы на фабрыцы і Наркамат прымушан быў абпавіць яго.

На запалкавай фабрыцы «Пралетарская перамога» ў Барысаве на працягу доўгага часу былі значныя прарывы ў рабоце. Некаторыя таварышы з барысаўскай партарганізацыі ўвесь час гаварылі, што для гэтага прадпрыемства даны надзвычай вялікія пляны, што Наркамлёгпрам недаўлічыў яго моладасьці, складу новых рабочых, слабой іх кваліфікацыі і г. д. Што там маладыя кадры, што само прадпрыемства маладое—зусім правільна. Але ня ў гэтым прычыны дрэннай работы. Асноўнай прычынай адставаньня было дрэннае кіраўніцтва. Таму, калегіі Наркамату прыйшлося і на гэтым прадпрыемстве зьмясьціць кіраўніцтва. У выніку перабудовы работы на працягу першага паўгодзьдзя гэта фабрыка дабілася вялікага зруху. Усе арганізацыі ф-кі сапраўды па-баявому пераключыліся на работу па-новаму і яна зараз ня толькі выконвае поўнасьцю колькасныя паказальнікі, але і дае добрую якасьць прадукцыі.

Гэта гаворыць аб тым, што прычыны дрэннай работы ня ў моладасьці прадпрыемства і маладых кадраў, а ,галоўным чынам, у няўмельні канкрэтна падыходзіць да работы кожнага цэху, агрэгату, брыгады, апэрацыйна кіраваць імі і аказваць практычную дапамогу ў іх рабоце.

Пашыраная праграма павінна быць выканана

— Гадавая праграма, — гаворыць далей тав. Грысевіч, — выпуску валавой прадукцыі ў 1932 г. зацьверджана партыяй і ўрадам па 406 млн. руб.

Лёгкая прамысловасьць павінна пераапрацаваць на сваіх гарбарнях 425 тыс. штук буйных скур і 1.549 тыс. штук дробных хромавых скурак; на футравых заводах — 344 тыс скурак. Абутковыя фабрыкі павінны выпусьціць 3.100 тыс. пар абутку. Тэкстыльныя — 7.770 тыс. мэтраў бавоўняных вырабаў і 253 тыс. мэтраў розных суконаў. На дзьвёх панчошных фабрыках імя Клары Цэткін і імя КІМ — 27.750 тыс. пар панчох. На швэйных фабрыках павінна быць пашыта розных польтаў 1.450 тыс. штук, мужчынскіх гарнітураў — 1.458 тыс. штук, брук суконных — 1.402 тыс. шт. і г. д.

Трэба адзначыць, што дырэктывы партыі аб выкідваньні на рынак непасрэдна мэтражу (тэкстыльныя вырабы і інш.) сустрэлі супраціўленьне з боку асобных гаспадарнікаў. Напрыклад, у Віцебску быў выпадак, калі дырэктар Саюзтрыкатажу ня выканаў дырэктывы Наркамату аб адгрузцы ў глыбінныя пункты раёну трыкатажу. Калегія Наркамату зьняла гэтага дырэктара з работы.

Гэта сьведчыць аб тым, што яшчэ ня ўсе работнікі зразумелі тое вялізарнае гаспадарча-палітычнае значэньне, якое зараз набывае максымальнае павялічэньне вырабу прадукцыі шырокага спажываньня і прасоўваньня яе па каналах савецкага гандлю ў вёску. Мы маем яшчэ рад праяўленьняў косных і бюракратычных адносін да выкананьня важнейшых дырэктыў партыі і ўраду.

— ЦК і СНК БССР, — кажа далей тав. Грысевіч, — абгаварыўшы пытаньне аб павялічэньні выпуску прадуктаў шырокага спажываньня, прапанавалі Наркамлёгпраму мабілізаваць усе ўнутраныя рэсурсы, усе адкіды для пераапрацоўкі іх на саміх прадпрыемствах. У выкананьне данай дырэктывы Наркамат намеціў выпусьціць дадатковай прадукцыі на 9.400 тыс. руб. звыш асноўнай праграмы.

— Калі ў Наркамлёгпраме, — кажа тав. Грысевіч, — пачалі даводзіць дырэктывы ЦК і СНК да аб'яднаньняў і прадпрыемстваў, дык асобныя работнікі разважалі, прыкладна, так: «Калі мы арганізуем уцільцэхі на рэспубліканскіх прадпрыемствах, дык арцелі прамысловай каапэрацыі і каапэрацыі інвалідаў прыдзецца закрыць, бо яны дагэтуль скарыстоўвалі адкіды нашых прадпрыемстваў». Такія думкі няправільныя і шкодныя. Праўда, што прамысловая каапэрацыя скарыстоўвала адкіды прадпрыемстваў, але яна поўнасьцю іх ніколі не пераапрацоўвала, у выніку чаго на фабрыках і заводах стварыліся вялікія залежы розных кавалкаў і абрэзкаў. Зараз іх пачалі скарыстоўваць.

Вось, напрыклад, **швэйная фабрыка «Кастрычнік»** выробляе з кавалкаў розныя рэчы (коўдры, фартушкі), прычым ня толькі дзіцячыя, але і для дарослых.

Па гарбарнай прамысловасьці, дзе таксама ёсьць значная колькасьць адкідаў, можна вырабляць шмат дадатковай прадукцыі.

— 3-4 месяцы таму назад, — кажа тав. Грысевіч, — мне давялося быць на **магілеўскай гарбарні імя Сталіна.** Я ўжо тады звярнуў увагу таварышоў з партыйнага, гаспадарчага і прафсаюзнага кіраўніцтва заводу на скарыстаньне адкідаў. Аднак, справа ня рухалася. Тыдзень таму назад тав. Кац зноў быў у Магілеве і выявіў, што там ёсьць вялікая колькасьць адкідаў, якія зусім не скарыстоўваліся. Ён дапамог заводу арганізаваць выраб з гэтых адкідаў загатовак для баціпак. Зараз спэцыялісты абутнікі кажуць, што з кавалкаў скуры выходзіць вельмі прыгожы баціпак. Возьмем такую рэч, як шлеі для хамутоў. У некаторых таварышоў укаранілася думка, што шлеі абавязкова трэба выраблянь з цэлага кавалку. Гэта няправільна. Зараз вырабляюцца шлеі з розных кавалкаў і яны ня горшыя, чым з цэлага.

Калі сапраўды ўзяцца, як належыць за мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў, па-гаспадарску падыйсьці да гэтай справы, мы зможам шмат чаго зрабіць у сэнсе вырабу прадукцыі шырокага спажываньня.

Трэба адзначыць, што на мясцох многія гарсаветы, РВК і іншыя арганізацыі яшчэ не надаюць гэтым пытаньням належнай увагі. Прафсаюзныя арганізацыі таксама яшчэ не разгарнулі масавай работы па мабілізацыі грамадзкай думкі вакол важнейшых мерапрыемстваў партыі і ўраду.

Мабілізацыі дадатковых рэсурсаў--увага і дапамога

Вырашэньне праблемы павялічэньня фондаў прамысловых тавараў залежыць ня толькі ад лёгкай прамысловасьці. Партыя і ўрад далі жорсткую дырэктыву па лініі ўсіх галін прамысловасьці. Так, прамкаапэрацыі дадзена заданьне дадаткова выпусьціць на шырокі рынак прадукцыі на 14.223 тыс. рублёў, цяжкай прамысловасьці — на 2.540 тыс. руб., па Наркамату лясной прамысловасьці — на 1.128 тыс. руб., мясцовай прамысловасьці — на 325 тыс. руб.

Па Наркамснабу дадатковы плян быў вызначан на суму 462.182 руб., але Наркамат снабжэньня гэту лічбу павялічыў да 2.504 тыс. руб. Гэта значыць, што вызначаны ўрадам і партыяй плян у парадку сустрэчнага павялічыўся на 2 з лішнім мільёнаў руб. Калі ўсе наркаматы пасьледуюць прыкладу Наркамснабу ў сэнсе выяўленьня дадатковых рэсурсаў, выраб прадукцыі можна будзе значна пашырыць і ў многа раз перакрыць вызначаную партыяй і ўрадам дадатковую праграму. Толькі пры ўмовах максымальнага выяўленьня і скарыстаньня ўсіх адкідаў прамысловасьці, і адпачасова ўпартай барацьбы за выкананьне асноўных плянаў магчыма павялічэньне фонду прамысловай прадукцыі дадаткова на мільёны руб. звыш асноўнай праграмы.

— Зараз, — кажа далей т. Грысевіч, — мы адкрываем майстэрні для пашыўкі як з фабрычнага матар'ялу, так і з матар'ялу саміх спажыўцоў. розных рэчаў па індывідуальных заказах. Перад намі стаіць вялізарная задача прыцягнуць у гэтыя майстэрні індывідуальнага заказчыка.

Той факт, што мы выкідваем значную колькасьць мэтражу на рынак, патрабуе ад нас максымальнага выпуску значнай колькасьці гузікаў і іншых прыкладаў, каб даць магчымасьць калгасьнікам і працоўным сялянам скарыстаць купленую імі мануфактуру. Зараз з нашых фабрык выпускаецца на шырокі рынак дадаткова 227.984 сотні штук гузікаў. Зразумела, гэта яшчэ мала, трэба будзе пайсьці на далейшае павышэньне выпрацоўкі.

Неабходна мабілізаваць усю пралетарскую грамадзкасьць прадпрыемстваў гарадоў і раёнаў на выкананьне баявых дырэктыў партыі і ўраду па выкарыстаньні ўнутраных рэсурсаў для максымальнага разгортваньня вырабу прадукцыі шырокага спажываньня.

Закрылася 3-я сэсія ЦВК БССР

11 ліпеня раніцою пленарнага пасяджэньня сэсіі ЦВК ня было. Усё ранішняе пасяджэньне было прысьвечана рабоце камісій на прапрацоўцы рэзалюцый.

Пасьля прыняцьця рэзалюцый па ўсіх пытаньнях парадку дня быў абвешчан перапынак.

Увечары ў будынку летняга тэатру саду «Прафінтэрн» сумесна з партыйнымі і прафсаюзнымі арганізацыямі, пленумам Менскага гарсавету адбылося заключнае ўрачыстае пасяджэньне сэсіі, прысьвечанае 12-гадзьдзю вызваленьня БССР ад белапалякаў.

З вялікім дакладам выступіў старшыня СНК БССР тав. **Галадзед**, спатканы бурнымі воплескамі.

Пасьля дакладу сэсію віталі прадстаўнікі Чырвонай арміі, чырвоных партызан, фабрык і заводаў.

Сакратар ЦВК тав. **Гніляка** агласіў пастанову ЦВК БССР аб узнагародзе ў адзнаку вызваленьня БССР ад белапалякаў ордэнам Працоўнага Чырвонага Сьцягу БССР актыўных удзельнікаў вызваленьня Беларускай ССР ад белапольскай акупацыі і актыўных удзельнікаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Сэсія паслала прывітальныя тэлеграмы **ЦК УсеКП(б)** і тав. **Сталіну, ЦК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР.**

Пасьля прыняцьця рэзалюцыі і заключнага слова тав. Чарвякова 3-я сэсія ЦВК БССР X скліканьня закрылася (БЕЛТА)

Аб практычных мерапрыемствах па рэалізацыі пастаноў ЦК УсеКП(б) аб савецкім гандлі і шырспажыве

Пастанова аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б

1. Пасьпяховае выкананьне пяцігодкі за 4 гады, шпаркі рост індустрыялізацыі краіны, сацыялістычнае рэканструкцыі сельскае гаспадаркі забясьпечылі завяршэньне будаўніцтва фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР і дазволілі на аснове няўхільнага правядзеньня генэральнай лініі партыі паставіць на 2-е пяцігодзьдзе асноўную палітычную задачу — пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Адным з асноўных вагароў выкананьня задач 2-ой пяцігодкі зьяўляецца разьвіцьцё таваразвароту. «Для забесьпячэньня бальшавіцкіх тэмпаў уздыму ўсёй народнай гаспадаркі і першэйга задавальненьня запатрабаваньняў шырокіх мас гораду і вёскі ў адносінах тавараў шырокага спажываньня першаступеннае значэньне мае разгортваньне таваразвароту. Разгортваньне таваразвароту — перш за ўсё прыцыцы — і правядзеньне прынцыпу гаспадарчага разрахунку ва ўсёй гаспадарчай рабоце зьяўляецца важнейшым стымулям для выяўленьня наяўных у нашай гаспадарцы паліарных і далёка яшчэ не выкарыстаных унутраных рэсурсаў, якія спрыяюць паскарэньню росту сацыялістычнага накапленьня і тым самым умацоўваюць матар'яльную базу усяго сацыялістычнага будаўніцтва. Разам з тым толькі на аснове разгортваньня таваразвароту можна забясьпечыць далейшае шпаркае паляпшэньне снабжэньня рабочых і працоўных вёскі прамысловымі таварамі і прадуктамі сельскай гаспадаркі» (з пастаноў XVII партканфэрэнцыі).

2. Пастановы партыі і ўраду аб сельска-гаспадарчым падатку на 1932 г., збожжазагатоўках, мясазагатоўках і аб парадку правядзеньня гандлю калгасаў, калгасьнікаў і працоўных аднаасобных сялян выцякаюць з усіх паляпшэньняў дырэктыў партыі (Майская адозва ЦК УсеКП(б), СНК СССР і Цэнтрасаюзу, рэзалюцыя Кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б) аб савецкім гандлі і пастанова XVII партканфэрэнцыі) і зьяўляецца неразрыўнай часткай генэральнай лініі партыі, праграмай далейшага разгорнутага сацыялістычнага наступленьня.

Пленум зварачае ўвагу ўсёй партыйнай арганізацыі на тое, што пытаньні разгортваньня савецкага гандлю зьяўляюцца рашаючымі пытаньнямі на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва, ад пасьпяховага вырашэньня якіх залежыць далейшае разгортваньне таваразвароту паміж горадам і вёскай, арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, уздым вытворчай актыўнасьці калгасьнікаў і працоўных аднаасобніка і стварэньне гэтым самым вялізарных дадатковых рэсурсаў для паляпшэньня снабжэньня рабочых і працоўных вёскі.

3. Адзначаючы маючыя месца першыя станоўчыя вынікі па разгортваньні калгаснага гандлю, якія выявіліся ва ўздыме палітычнай і вытворчай актыўнасьці працоўных сялян у часе правядзеньня веснавой сяўбы, ва ўмацаваньні прыцёну сельска - гаспадарчых прадуктаў на рынак, у намеціўшайся тэндэнцыі зьніжэньня рыначных цэн, пленум ЦК і ЦКК разам з тым з усёй рашучасьцю падкрэсьлівае, што рэалізацыя гэтых важнейшых дырэктыў партыі праходзіць вельмі нездавальняюча, марудна, без належнай мабілізацыі мясцовымі партыйнымі арганізацыямі ўсіх сіл партыі, рабочае клясы, калгасных мас і аднаасобнага блянцка - серадняцкага сялянства на вырашэньне гэтых баявых задач.

Пленум прызнае зусім невыстарчальнай работу гарсаветаў, РВК, калгасных і зямельных арганізацый па правядзеньні масавай растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў, па арганізацыі масавага выхаду калгасьнікаў на базар, па арганізацыі такога савецкага базару, які стымуляваў-бы прыцёк с.-г. прадуктаў на рынак. Пленум адзначае, што каапэрацыйныя арганізацыі і дзяржгандаль не праяўляюць патрэбнай ініцыятывы гібкасьці па разгортваньні таваразвароту, асабліва на вёсцы, па арганізацыі суцэльнага патоку прамтавараў на рынак, па аказаньні арганізаванага эканамічнага ўзьдзеяньня на зьніжэньне рыначных цэн, па аказаньні калгасьніку практычнай дапамогі ў нападжаньні гандлю сельска -гаспадарчымі прадуктамі.

Пленум канстатуе, што работа па разгортваньні дадатковага вырабу прадуктаў шырокага спажываньня не разгорнута, асабліва па прамысловых аб'яднаньях Наркамату лёгкай прамысловасьці (шэйная, абутковая і паліграфічная), Наркамлесправу (Пепертрэст), Белсам прамсаюзу (абутковая, тэкстыльна - шэйная), Хэрчпрамсаюзу, Наркамснабу (шчацінна-шчотачнае аб'яднаньне), якія ня толькі не праяўляюць ініцыятывы па далейшым разгортваньні вырабу прадметаў шырокага спажываньня, але навэт не забясьпечылі ў мінімальнай меры выкананьне ўжо намечаных ЦК КП(б)Б і СНК БССР мерапрыемстваў па шырспажыве.

Пленум прызнае, што такі нездавальняючы стан выкананьня партыйных дырэктыў аб савецкім гандлі і шырспажыве выцякае з недасьцэнкі радам партыйных, савецкіх, гаспадарчых і каапэрацыйных арганізацый усёй палітычнай і эканамічнай важнасьці мерапрыемстваў партыі, выключнай непаваротлівасьці гэтых арганізацый і бюракратычных адносін з боку раду працаўнікоў да гэтых важнейшых дырэктыў партыі.

Усё гэта прыводзіць, з аднаго боку, да правапартыністычнага самацёку і праяўленьня кулацка - капіталістычных тэндэнцый, якія выражаюцца ў спробах разгортваньня калгаснага гандлю ва ўшчэрб цэнтралізаваным загатоўкам, ажыятажу і спэкуляцыйнай дзейнасьці асобных каапэрацыйных і гандлёвых арганізацый, дэзарганізатарскі ўплываючы на рынак, спабай барацьбы з перакупшчыкамі і спэкулянтамі, а з другога боку да дапушчэньня «лявацкіх» перагібаў, скажэньняў лініі партыі, бюракратычнай рэглямантацыі калгаснага гандлю, адміністраваньня, проціпастаўленьня калгасьніка, аднаасобніка, таваравымённых апэрацый, адміністрацыйнаму бюракратычнаму прымацаваньню калгасаў да прадпрыемстваў і г. д.

Пленум абавязвае ўсю партыйную арганізацыю неадкладна дабіцца карэннага пералому на гэтым адказнейшым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва і прапануе:

У галіне пашырэньня вырабу прадметаў шырокага спажываньня:

1. Лічачы, што разгортваньне работы па вырабе прадметаў шырокага спажываньня зьяўляецца важнейшай умовай узмацненьня таваразвароту і стымуляваньня калгасьніка і працоўнага аднаасобніка ў справе разгортваньня гандлю сельска - гаспадарчымі прадуктамі, пленум ЦК і ЦКК абавязвае Наркамлегпрам, НКЦПрам, Наркамлесправ, Наркамснаб, мясцовую прамысловасьць і прамкаапэрацыю побач з абавязковым выкананьнем асноўнай гадавой праграмы па вырабе прадметаў шырспажыву поўнасьцю выцякаць зацьвердженую бюро ЦК і СНК БССР дадатковую праграму вырабу прадметаў шырспажываньня да канца 1932 г. (чэрвень - сьнежань):

Па НКЛПраму	9.400.000 руб.
« НКЦПраму	2.540.000 руб.
«Прамкаапэрацыі	14.423.000 руб.
«Леспраму	1.128.500 руб.
«Мясцов. прам.	1.512.000 руб.
«Наркамснабу	462.180 руб.
«Інвалідн. каапэрацыі	799.800 руб.
«Іншых арганізацыях	540.000 руб.
УСЯГО	30.605.480 руб.

2. Лічачы гэту праграму мінімальнай, пленум абавязвае дзяржаўную і мясцовую прамысловасьць, прамкаапэрацыю неадкладна распрацаваць рад зусім практычных мерапрыемстваў, якія забясьпечылі-б на аснове рацыяналізацыі вытворчасьці пепшае выкарыстаньне адыходаў, уцёпю, зьмену асартымэнту — па вялічэньне намечанай праграмы.

Адзначаючы ініцыятыву перадавых заводаў Саюзу (Любарэцкі завод і інш.), таксама мерапрыемствы асобных беларускіх заводаў (завод імя Молатава і інш.) па арганізацыі спэцыяльных уцёльцэхаў, лічыць разам з гэтым, што мясцовыя партыйныя і фабрычныя арганізацыі зусім не падхапілі гэту ініцыятыву. Пленум абавязвае мясцовыя партыйныя і фабрычныя арганізацыі паставіць задачу разгортваньня вырабу прадметаў шырокага спажываньня, як адну з важнейшых задач гаспадарчай і партыйнай работы на вытворчых прадпрыемствах, мабілізуючы на вырашэньне гэтай задачы масы рабочых, вынаходцаў, ІТР.

3. Пленум катэгарычна асуджае гарадлівыя адносіны асобных гаспадарчых арганізацый да нападжаньня вытворчасьці прадметаў гаспадарчага ўжытку, дробных прадметаў, патрэбных працоўнаму спажыўцу ў быце і гаспадарцы. Пленум абавязвае арганізацыі прамысловасьці і прамкаапэрацыі сумесна са спажывецкай каапэрацыяй у дэкадны тэрмін перагледзець увесь асартымэнт прадукцыі, якая вырабляецца прамысловасьцю і прамкаапэрацыяй для шырокага рынку, унёсшы неадкладна патрэбныя зьмены як у бок пашырэньня на трэбнага асартымэнту, так і ў бок найлепшага прыстасаваньня яго да патрэб рабочых і працоўных сялян. Пленум у прыватнасьці, абавязвае прамысловасьць і прамкаапэрацыю, пад адказнасьць іх кіраўнікоў, неадкладна прыступіць да пашырэньня наяўнай і нападжаньня новай вытворчасьці.

4. Адзначаючы вялікую ролю, якую павінна адыграць прамысловая каапэрацыя ў справе разгортваньня вырабу прадметаў шырокага спажываньня, пленум лічыць, што з боку раду партыйных, савецкіх арганізацый на мясцох быў праяўлены нецярпімыя, няўважлівыя адносіны да саматужных арцеляў, што выявілася ў адміністраваньні арцелі, у неаказаньні ёй патрэбнай дапамогі па нападжаньні вытворнасьці, па падшуканьні памяшканьня (ёсьць выпадкі, калі выкідвалі арцелі з займаемых памяшканьняў), па матар'яльна-бытавым абслугоўваньні членаў арцелі. Пленум абавязвае партыйныя і савецкія арганізацыі на мясцох з усёй уважлівасьцю разглядзець патрэбы саматужных арцеляў, забясьпечыўшы ім рэальную дапамогу ў пашырэньні вырабу прадметаў шырокага спажываньня на аснове выкарыстаньня мясцовага сырцу.

5. Адзначаючы маючую месца тэндэнцыю ў цэнтральным апараце прамкаапэрацыі да лішняй цэнтралізацыі работы арцелі, што вядзе да падаўленьня ініцыятывы арцеляй,—пленум абавязвае Белкаапрамсаюз у 2-хдэкадны тэрмін распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы ў галіне паляпшэньня кіраўніцтва арцелямі ў напрамку ўздыму ва самастойнасьці, разгортваньня яе ініцыятывы і ўнесьці гэтыя мерапрыемствы на разгляд бюро ЦК.

Пленум абавязвае Сампрамкаапэрацыю і Калгасцэнтр, побач з разгортваньнем калгаснага гандлю продуктамі с.-г. разгарнуць работу па арганізацыі калгасамі, калгасьнікамі саматужных вырабаў з мясцовага сырцу (дрэва, гліна, расьліны і інш.).

6. Канстатуючы, што асноўная праграма вырабу прадметаў шырокага спажываньня выкананa на працягу першага паўгодзьдзя вельмі нездавальняюча, што зьяўляецца зусім нецярпімым, пленум абавязвае НКЛПрам, НКЦПрам, НКЛес, НКСнабжэньня, Прамкаапэрацыю і мясцовую прамысловасьць дабіцца ў бліжэйшыя дэкады карэннага пералому ў справе выкананьня асноўнага прамфінпляну і дадатковай праграмы па шырспажыве, у максымальнай меры скарыстоўваючы пры гэтым адыходы і ўцёль.

7. Пленум даручае бюро ЦК ажыцьцяўляць штодзённы нагляд і кантроль над гандлевымі, партыйнымі і прафсыянальнымі арганізацыямі ў справе разгортваньня работы па выробе прадметаў шырокага спажываньня, самым рашучым чынам рэагуючы на бюракратызм, непаваротлівасьць у вырашэньні гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай задачы, выяўляць канкрэтных вінаўнікоў, зрываючых, або тармозячых правядзеньне ў жыцьцё дырэктыў партыі аб шырспажыве, прыцягваючы іх да самай строгай адказнасьці.

У галіне арганізацыі сустрэчнага гандлю прамтаварамі

Пленум прызнае становішча сустрэчнага гандлю прамтаварамі надзвычай нездавальняючым і лічыць, што гэта тлумачыцца выключна слабой работай спажыўкаапэрацыі—ад Белкаапсаюзу да сельспажыўтаварыстваў аспабленьнем гандлёвай дзейнасьці большай часткі спажыўтаварыстваў і райспажыўсаюзаў, няўменьнем імі арганізаваць мясцовы таваразварот па гандлі прадметамі сельскага ўжытку мясцовага вырабу, невыстарчальнай работай гандлёвых аб'яднаньняў Белкаапсаюзу па завозе тавараў у вёску.

Пленум прапануе Белкаапсаюзу і мясцовым партыйным арганізацыям неадкладна дабіцца рашучага ўзмацненьня гандлёвай дзейнасьці нізавога сельскага зьвяна спажывецкай каапэрацыі, паставіўшы задачу перад сельспажыўтаварыствамі на толькі гандаль дэфіцытнымі таварамі, заваёмымі з цэнтру, а ў першую чаргу навучыць сельспажыўтаварыствы, усе зьвенні спажыўсыстэмы «зьбіраць распыленыя таварныя каштоўнасьці і выкліканць да жыцьця новыя» (ЛЕНІН).

У адпаведнасьці з гэтым пленум чарговы аба вязак спажыўкаапэрацыі—пашырэньне таваразвароту за кошт шырокага ўключэньня ў гандаль прамметамі сельскага ўжытку вырабу мясцовай прамысловасьці і саматужнай каапэрацыі гандаль шчапнымі таварамі, вёдрамі, карытамі, лямпамі, шклянкамі, мэбляй, мэталявырабамі і інш.

Пленум ускладае на спажывецкую каапэрацыю абавязак усямерна поўна ўлічваць запатрабаваньні спажыўца, прад'яўляць прамысловым прадпрыемствам неабходныя патрабаваньні ў справе паляпшэньня асартымэнту і якасьці прадуктаў, у справе пашырэньня вырабу прадметаў шырокага спажываньня, пры гэтым пленум патрабуе ад усіх партыйных арганізацый нападзіць дасканалы кантроль за тым, каб каапэрацыйна-гандлёвыя арганізацыі не завозілі на вёску няходкія, нядобра якасныя, непатрэбныя вёсцы тавары; рашучая барацьба павінна быць абвешчана ўсялякім спробам фармальна выканаць дырэктывы аб завозе на вёску прамтавараў бяз уліку асартымэнту. Партыі патрэбна ня гэта, а тое, каб вёска атрымала, што ёй крайня патрэбна, а ня тое, што зажадаецца бюракратам.

Пленум абавязвае Белкаапсаюз і Белгандаль на працягу дэкадзнага тэрміну перагледзець увесь асартымэнт тавараў, якімі гандлюе сыстэма, адабраўшы дадаткова для завозу ў вёску тавары сельскага асартымэнту. Абавязаць Белкаапсаюз на працягу III кварталу давесьці ўдзельную вагу завозу тавараў у вёску ня менш 50 проц., устанавіўшы кожнаму тавару адпаведны процант у адносінах да гораду і вёскі.

Прапанаваць Белкаапсаюзу ўстанавіць строгі кантроль за поўным і хутчэйшым давядзеньнем тавараў да вёскі, не дапусьціўшы якога-б там ні было выдатканьня фондаў шырокага рынку для другіх мэт ці асяданьня сельскіх фондаў у раённых цэнтрах, мястэчках і інш.

Падкрэсьліваючы асабліва значэньне правільнай пастаноўкі ўліку прасоўваньня тавараў, асабліва ў вёску, на што з усёй вострасьцю паказаў т. Постышаў у сваім артыкуле, абавязаць гандлёвыя арганізацыі, асабліва БКС дабіцца рашучага пералому ў справе пастаноўкі ўліку прасоўваньня таварных фондаў па ўсёй пэрыферыі.

Пленум ухваляе мерапрыемствы бюро ЦК па ўзмацненьні завозу тавараў у вёску і разам з тым абавязвае БКС і райсаюзы забясьпечыць такую арганізацыю завозу тавараў у раён і ў сельспажыўтаварыствы, якая-б знаходзілася ў простай залежнасьці ад таваркасьці раёну, ад ходу загатовак як у разрэзе раёну, так і ў разрэзе сельсавету.

Адзначаючы невыстарчальнасьць гандлёвай сеткі на вёсцы, асабліву слабасьць яе ў глыбінных пунктах раёнаў, пленум прапануе БКС на працягу III-га кварталу павялічыць раздробную сельскую сетку, разгортваючы пры гэтым сетку ў найбольш таварных сельскіх пунктах. Даручыць бюро ЦК вызначыць колькасьць адчыненьня гандлёвых адзінак па сельскай сетцы.

Надаючы асаблівае значэньне рабоце сельспажыўтаварыстваў, як рашаючаму зьвяну спажыўкаапэрацыі па арганізацыі гандлю на вёсцы, пленум ЦК прапануе Белкаапсаюзу, райкомам партыі неадкладна прыступіць да сур'ёзнага ўмацаваньня праўленьняў сельспажыўтаварыстваў, спыніўшы практыку забіранья з сельспажыўтаварыстваў апрацаваўшых сябе кадраў і забясьпечыўшы праўленьні сельспажыўтаварыстваў работнікамі, здольнымі разгортваць савецкі гандаль на вёсцы.

Даручыць бюро ЦК у месячны тэрмін распрацаваць рад канкрэтных мерапрыемстваў па ўзмацненьні сельскай сеткі спажыўкаапэрацыі партыйнымі кадрамі за лік гарадзкога і раённага актыву для работы ў сельспажыўтаварыствах у якасьці старшынь і загадчыкаў крам сельспажыўтаварыстваў.

Прапанаваць БКС правесьці на працягу першай дэкады ліпеня куставыя нарады ўсіх старшынь сельспажыўтаварыстваў па пытаньні аб разгортваньні таваразвароту на вёсцы і рэалізацыі гэтых пастаноў пленуму ЦК КП(б)Б.

У галіне арганізацыі савецкіх базараў і разгортваньня гандлю сельска-гаспадарчымі прадуктамі

Пленум адзначае недапушчальна марудны ход рэалізацыі пастаноў ЦК КП(б)Б ад 1-га чэрвеня аб разгортваньні гандлю на рынках. Прапанаваць гарсаветам і РВК у двухтыднёвы тэрмін правесьці наступныя мерапрыемствы:

а) устанавіць дні савецкага базару, шырока паведамляўшы аб гэтым калгасы і аднаасобнікаў;

б) прывесьці ў патрэбны выгляд базарныя пляцы, адрамантаваўшы дарогі, што вядуць да базараў;

в) забясьпечыць неадкладную пабудову неабходнай колькасьці паркоў і палатак для сталага гандлю на базарах;

г) забясьпечыць арганізацыю справачных бюро, пунктаў мэдычнай і юрыдычнай дапамогі, заежджых двароў, чайных, цырульняў і інш.;

д) неадкладна прыступіць да разгортваньня будаўніцтва новых базараў, у першую чаргу ў рабочых раёнах.

Даручыць ЭКАСА ў дэкадны тэрмін разгледзець усе пытаньні, зьвязаныя з рэалізацыяй гэтай пастановы, і зацьвердзіць спэцыяльны плян базарнага будаўніцтва паркоў, чайных і інш. і ўнесьці на зацьвярджэньне бюро ЦК.

Абавязаць БКС, ЗРК, ЦРК і Белгандаль і ўсю таваразраводзячую сетку забясьпечыць сустрэчны гандаль прамтаварамі на базарах адпаведным асартымэнтам патрэбных селяніну тавараў. Прапанаваць БКС вызначыць спэцыяльным плянам масу тавараў і асартымэнт іх, які спажывецкая каапэрацыя павінна рэалізаваць на савецкіх рынках у прамысловых гарадох.

Адзначаючы зусім слабую барацьбу гарсаветаў і РВК са спэкулянтамі і перакупшчыкамі, пленум прапануе бюро ЦК спэцыяльна разгледзець пытаньне аб мерах барацьбы з перакупшчыкамі і спэкулянтамі, кіруючыся дырэктывамі ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб тым, каб «не дапушчаць адкрыцьця магазынаў і паркоў прыватнымі гандлярамі і ўсялякіх выкараняць перакупшчыкаў-спэкулянтаў, якія прабуюць нажыцца за кошт рабочых і сялян».

Пленум абавязвае спажывецкую каапэрацыю і інш. гандлюючыя арганізацыі забясьпечыць бесьперабойнае і добра-арганізаванае абслугоўваньне таварамі калгасьніка і працоўнага аднаасобніка.

Пленум прапануе гарсаветам, РВК, органам спажывецкай каапэрацыі аказваць максымальнае практычнае садзейнічаньне калгасам у арганізацыі гандлю с.-г. прадуктамі шляхам прадастаўленьня ім памяшканьняў для гандлю, для хаваньня нерэалізаванай часткі прадуктаў, шляхам аказаньня ім непасрэднай дапамогі ў арганізацыі самога гандлю.

Пленум канстатуе, што калгасная сыстэма ў надзвычайна невыстарчальнай ступені разгарнула работу па разгортваньні сеткі магазынаў і паркоў як калгасамі, так і калгасными аб'яднаньнямі. Яшчэ больш нездавальняючым пленум прызнае стан разгортваньня гандлю саўгасамі. Абавязаць НКЗем, Калгасцэнтр на працягу ліпеня месяца адкрыць усю сетку, згодна намечанага пляну.

Пленум прапануе ўсім партыйным арганізацыям разгарнуць бязьлітасную барацьбу на два фронты супроць правых і «лявацкіх» загібаў і прыміранцтва да іх, з усёй рашучасьцю перасякаць малейшыя скажэньні лініі партыі ў савецкім гандлі.

Пленум асабліва перасьцерагае партыйныя арганізацыі ад спроб проціпастаўленьня калгаснага гандлю задачы выкананьня цэнтралізаванага пляну загатовак. Пленум падкрэсьлівае, што асноўная задача кожнай гаспадарчай і партыйнай арганізацыі павінна заключацца ў тым, каб з посьпехам вырашаць абедзьве задачы—сваячасова і поўнасьцю выканаць плян цэнтралізаваных загатовак і максымальна разгарнуць калгасны гандаль за кошт продажу калгасамі, калгасьнікамі і працоўнымі аднаасобнікамі лішкаў сваёй прадукцыі і тэй прадукцыі, якая вырабляецца звыш пляну спэцыяльна для мэт гандлю.

Адзначаючы, што рэалізацыя апошніх пастаноў ЦК і СНК абавязвае спажывецкую апэрацыю да максымальнага разгортваньня дэцэнтралізаваных загатовак для арганізацыі снабжэньня рабочых, пленум прапануе Белсаюзу і дзяржаўным гандлюючым арганізацыям забясьпечыць разгортваньне дэцэнтралізаваных загатовак у глыбінных пунктах вёскі, на сельскіх базарах, кірмашох, спыніўшы неадкладна самазагатоўкі на гарадзкіх базарах прамысловых гарадоў (Менск, Віцебск, Гомель, Бабруйск, Магілеў, Барысаў, Рэчыца, Ворша). Пленум абавязвае ўсе зьвенні спажывецкай каапэрацыі рашучым чынам выкараніць з практыкі работы па самазагатоўках факты ажыятажу таваравымённых апэрацый, якія разбураюць рынак і спрыяюць узьвінчаваньню цэн. Пленум лічыць, што абавязкам спажывецкай каапэрацыі зьяўляецца аказаць арганізаванае ўзьдзеяньне на зьніжэньне рыначных цэн шляхам продажу с.-г. прадуктаў у фабрычных цэнтрах, атрыманых ад самазагатовак і ў першую чаргу ў выніку доўгіх дагаворных узаемаадносін з калгасамі па стварэньні для патрэб рабочага снабжэньня дадатковых харчовых крыніц (адкорм жывёлы, разьвядзеньне трусоў, птушак, пера апрацоўка гародніны, малочных прадуктаў і г. д.).

Пленум абавязвае ўсе партыйныя арганізацыі прыняць рэальныя меры, забясьпечаючыя ўмацаваньне кадраў, патрэбных калгаснай сыстэме для разгортваньня калгаснага гандлю.

Пленум падкрэсьлівае, што рэалізацыя пастаноў аб калгасным гандлі ў значнай меры ўпіраецца ў арганізацыю масавай растлумачальнай работы сярод калгасных мас і працоўных вёскі і гораду.

Між тым партыйныя, савецкія, прафэсыянальныя, каапэрацыйныя і калгасныя арганізацыі, камсамол, цэнтральны і раённы друк зусім слаба праводзяць работу па папулярызацыі пастаноў партыі аб калгасным гандлі, па арганізацыі рабочых, калгасьнікаў, працоўных аднаасобнікаў вакол выкананьня гэтых задач.

Пленум абавязвае культпроп і агітмасавы аддзел ЦК намеціць рад практычных мерапрыемстваў, забясьпечваючых шпаркае і выразнае давядзеньне пастаноў партыі аб калгасным гандлі да шырокіх мас працоўных і забясьпечыць актыўны ўдзел друку і масавых пралетарскіх арганізацый у ажыцьцяўленьні ўсіх пастаноў партыі і ўраду па гэтым пытаньні.

Пленум лічыць, што барацьба за разгортваньне савецкага гандлю і прасоўваньне да спажыўца прадметаў шырокага спажываньня — справа бальшавіцкага гонару кожнага камуніста. У залежнасьці ад уменьня шпарка і выразна вырашаць гэтыя задачы Цэнтральны камітэт будзе меркаваць аб здольнасьці партыйнага камітэту, кожнага камуніста спраўляцца з баявымі дырэктывамі партыі.

БУДЗЕМ У ПЕРШЫХ РАДОХ АБАРОНЦАЎ ЗАВАЯВАНЬНЯЎ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

Заклік ударнікаў фінансавага фронту Койданаўскага пацыянальнага польскага раёну да ўсіх рабочых, калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў БССР

— Койданаўскі нацыянальны польскі прымежны раён адным з першых па БССР выканаў плян рэалізацыі пазыкі імя 4-га завяршальнага. Польскі нацыянальны раён—на перадавых пазыцыях барацьбы за фінансаваньне сацыялістычнай будоўлі, за заваяваньне подступаў да другой пяцігодкі. Хіба гэта не зьяўляецца лепшым доказам правільнасьці нацыянальнай палітыкі партыі і савецкай улады!

Наша перамога на фронце рэалізацыі тлумачыцца вельмі проста: кожны рабочы, калгасьнік і працоўны аднаасобнік Койданаўскага раёну, дзякуючы шырокай масавай рабоце, добра вразумеў куды ідуць дзяржаўныя пазыкі. Яны вразумелі, што новая пазыка—гэта новыя сотні і тысячы тон чыгуну і сталі, новыя сотні і тысячы трактараў і камбайнаў, новыя фабрыкі, школы, клюбы і тэатры.

12 год назад узброеныя банды белапалякаў пад націскам Чырвонай арміі, падтрыманай усім працоўным насельніцтвам Саюзу, прымушаны былі адступіць з БССР. Згараўшыя вёскі, сотні спаленых дамоў, гвалт і грабежніцтва—вось чым адзначылі свой уход акупанты.

За мінулыя 12 год, дзякуючы правільнаму кіраўніцтву камуністычнай партыі, мы дабіліся вялікіх перамог на фронце гаспадарча-культурнага будаўніцтва. На сёнешні дзень ў раёне ёсьць дзьве машына-трактарныя станцыі, 8 саўгасаў. У нашым раёне сацыяльнай калектывізацыі ліквідавана няпісьменнасьць сярод працоўнага насельніцтва і ўведзена ўсеагульнае навучаньне. У раёне ў 1930 г. было ўсяго толькі 16 дзіцячых дамоў і ясьляй. Толькі ў гэтым годзе на дзяржаўныя сродкі будуць адкрыты 104 дзіцячыя сады, пляцоўкі і ясьлі. На Койданаўшчыне працуе 45 польскіх школ, адкрываецца польскі жывёлагадоўчы тэхнікум. Пабудаваны два радыё-вузлы, калі 450 кватэр рабочых і калгасьнікаў, клюбы, сталоўкі. У раёне працуе 8 кіно-перасовак і 1 гукавы кіно-тэатр.

Вялізарнае палітычнае значэньне мае той факт, што на Койданаўшчыне выдаецца радыёгазэта і дзьве друкаваныя газэты: адна па польскай, другая на беларускай мове.

Вось як выглядае раён, у якім у 1920 годзе камандавалі памешчыкі графы Чапскія і князі Радзівілы.

Аб гэтых перамогах добра ведаюць рабочыя і калгасьнікі Койданаўшчыны, і гэта адыграла рашаючую ролю ў пасьпяховай рэалізацыі пазыкі.

Працоўнае насельніцтва Койданаўшчыны добра ведае таксама, што робіцца недалёка ад нас, у панскай Польшчы, у Заходняй Беларусі. Шыбеніцы, крывавыя расправы над працоўным насельніцтвам, галеча і беспрацоўе, страшэнны нацыянальны ўціск, паход на беларускія і украінскія школы—вось палітыка польскага фашызму, вось чым можа ганарыцца ўлада памешчыкаў і фабрыкантаў. Толькі адно параўнаньне становішча ў фашысцкай Польшчы і ў краіне пралетарскай дыктатуры ўзмацніе наш энтузіязм у барацьбе за пабудову сацыялізму.

Фашысцкая Польшча рыхтуецца зараз да ўзброенага нападу на нашу сацыялістычную бацькаўшчыну. Мы заяўляем рабочым і сялянам усёй БССР, Цэнтральнаму Камітэту партыі і ўраду, што ў выпадку нападу ўзброеных белапольскіх банд на наш Саюз, **мы, працоўныя польскага нацыянальнага прыменнага раёну, будзем у першых радох абаронцаў заваяваньняў Кастрычніцкай рэвалюцыі.**

Перавыканаўшы плян рэалізацыі пазыкі, мы і далей вядзем шырокую масавую работу (эстафэты, мітынгі, перакліч кі, буксіры). На буксір узяты суседнія раёны. Мы заклікаем усіх рабочых, калгасьнікаў і працоўных сялян БССР выканаць і перавыканаць плян рэалізацыі пазыкі, дэманструючы гэтым сваю гатоўнасьць абараняць Савецкі саюз, сваё жаданьне выканаць першую пяцігодку за чатыры гады і пабудаваць бясклясавае сацыялістычнае грамадзтва ў другой пяцігодцы.

Л. Астравер

Дзень прараба Валаховіча

Студэнт 3-га курсу Палтаўскага сельскабудаўнічага інстытуту Валаховіч пэрэваўся ў апошнія дні. Сьніс калгасельбудтрэсту, куды будуць накіроўваць студэнтаў на практыку, вывешан дзённа, але Валаховіч ня можа вырашыць, куды прасіцца. Хочацца на Каўказ, дзе горы сярэбнымі шуплямі падпіраюць нябеснае скляпеньне, хочацца ў Казакстан, дзе касаслойны лес стрымлівае сыпучыя пяскі, хочацца ў неасяжную Сібір...

Але турыстычныя мары Валаховіча расьсеяліся раптам: яго накіравалі ў заходні фарпост Савецкага саюзу—БССР.

Нова-адбудаваны Менск. Сухі, чэрствы прыём у трэсьце. Мястэчка Смалявічы. У прыўлятай хібарцы, якая патыхае торфам, было аформлена прыбыцьцё практыканта Валаховіча і тут-жа адбылося назначэньне: «Накіраваць прарабам у саўгас Лагоза».

Сьвінаводчы саўгас Лагоза быў яшчэ пядаўна часткаю саўгасу Лупаўшчына. Толькі пасьля разбуўненьня перайшоў ён на самастойнае гаспадараньне. Зьмяніліся пляны будаўніцтва: аборы трэба пашыраць, сьвінарнік перабудаваць пад сьвіны камбінат, адзін інтэрнат—пад клюб і сталоўку...

Рана ўстае сонца ў Лагозе, але яму ўсё-ж не ўдаецца апярэдзіць прараба Валаховіча. Плян работ на гэты дзень быў складзен напярэдадні, абмеркаваны з дзесятнікам, карткі вытворчага заданьня раздаены, але штодня, да ўсходу сонца пры канцілцы, а часта і пры агоньчыку папяросы, складаў Валаховіч плян для сябе, для прараба.

Сонца адразу разбушавалася. Над балотамі вісела ліловая дымка. Валаховіч паглядзеў у далеч на палі і падумаў: «Генэральнага пляну сядзібы яшчэ няма, дзе і лазат што будаваць—невядома. Учора ткнуў новы дырэктар палкай—тут пабудуеш гараж. Адмераў тысячу крокаў: тут пабудуеш пажарны хлеў». Агледзіўся тады прараб, расплянаваў вучастак і абурыўся: —Гараж у цябе будзе стаяць у лагчыне, зальле яго.

Дырэктар вялікі, грузны, усьміхнуўся: «Ты маеш рацыю, хлопец, зальле».

Выбралі іншае месца. Адпаведнае...

І вось зараз накіроўваецца Валаховіч на плянаваньне.

З баракаў і інтэрнатаў выходзяць цесьляры. Сярод іх Колька, сакратар камсамольскай ячэйкі, дзесятнік, таксама практыкант з Палтаўскага тэхнікуму. Колька нечасытны масавік: ён скарыстоўвае кожную вольную хвіліну. Вось і зараз, крочачы побач з калгасьнікамі, ён ім растлумачвае гаспадарчае назначэньне новай пазыкі. Колька з брыгадай цесьляроў накіроўваецца ў лес на загатоўкі страшлаў, шуляў, балек, скантовак.

На твар Валаховіча напаўзла ўхмылка: ён, прараб Валаховіч, зламаў упартасьць старых. Усяго чатыры дні таму назад цесьляры катэгарычна заявілі: «Ня пойдзем у лес... Не лесарубы мы». Валаховіч, а пасьля яго Колька, растлумачвалі, што саўгас ня можа ў часе слябы даваць транспарт для падвозкі матар'ялаў. А будаваць трэба, пёплыя дні ўплываюць. Каб ня траціць часу, трэба частку цясьлярскіх работ рабіць у лесе, на месцы распрацоўкі...

— Колька, памятай! Сёньня дубовыя стойкі!—крыкнуў Валаховіч.

— Ведаем,—усе разам адказалі цесьляры.

Расплянаваньне заняло больш часу, чым меркаваў Валаховіч: пятай або шостай рыдлёўкай грабары ўжо разьмінаілі клейкую гліну, а пасьля шэсьцтай—пага рабочых стаяла ў каламутнай вадзе. Прышлося адсунуць гараж на некалькі соцень мэтраў. Валаховіч навёў лініі, рабочыя ўбілі колікі, нацягнулі вяроўкі. Сам прараб калупаў зямлю ў некалькіх мясцох і, пераканаўшыся, што грунт добры, пашоў.

Сьвінарнік на 100 штук будаваўся павольна. Стараста арцелі смаленцаў—Ерафеіч, усё церабіў русую бараду, ды ўздыхаў:

— Расцэначкі, таварыш інжынэр, расцэначкі нізкія. Якая работа можа быць?

І цяпер, як толькі Ерафеіч убачыў прараба, ён уваткнуў сякеру ў бервяно, злапнуў на рукі і ўстаў.

— Усё расцэначкі, Ерафеіч?

— Расцэначкі, таварыш інжынэр.

Цесьляры акружылі прараба. Хацелі ўсе разам наваліцца на яго са скаргамі. Валаховіч сеў на маластае бервяно, паглядзеў на раскіданы матар'ял і павольна, ціхі даўно вядомае, сказаў:

— Самі вінаваты. Ведаеце чаму мала зарабляеце? Таму, што працаваць па-новаму ня ўмееце. Расцэнкі ня нізкія, пры іх ты можаце зарабіць больш, чым летась.

— Як-жа, таварыш інжынэр.—пакрыўдзіўся Ерафеіч,—скажам, да прыкладу, я шостага разраду, а атрымліваю...

— Ты слухай, Ерафеіч, а потым спрачайся.

— Правільна!—пацьвердзілі цесьляры.

— Паслухаем, таварыш інжынэр.

— Вось што, таварышы,—зьвярнуўся Валаховіч да ўсіх.—Матар'ял у вас раскіданы. Патрэбнае бервяно вы шукаеце поўгадзіны, потым падтрабаеце яго да пабудовы, на гэта таксама хвілін дваццаць тра

Аб выніках ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б

Рэзалюцыя пашыранага пленуму Менскага гаркому КП(б)Б разам з партактывам гарпартарганізацыі па дакладу т. Шаранговіча 9 ліпеня 1932 году

Заслухаўшы даклад т. **Шаранговіча** аб выніках ліпеньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, пашыраны пленум Менскага гаркому КП(б)Б з актывам гарпартарганізацыі цалкам і поўнасьцю ўхваляе і далучаецца да пастаноў пленуму.

Актыў адзначае, што пастаўленыя пленумам задачы ў галіне правядзеньня прапалачна-ўборачнай кампаніі, разгортваньня савецкага гандлю, перабудовы і разгортваньня партыйна-масавай работы—зьяўляюцца рашаючымі на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва.

У 3-ю бальшавіцкую вясну партыя атрымала новую бліскучую перамогу ў барацьбе за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі. Гэтай перамогай СССР канчаткова замацаваўся на сацыялістычным шляху, забясьпечыў выкананьне пяцігодкі ў 4 гады і бальшавіцкую падрыхтоўку да 2-ой пяцігодкі пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Пленум з актывам з асаблівым здавальненьнем падкрэсьлівае пасьпяховае заканчэньне сяўбы па БССР і што адставаньне, якое мела месца ў пачатку палявых работ, пры дапамозе і спэцыяльных указаньнях ЦК УсеКП(б), Цэнтральным Камітэтам КП(б)Б у асноўным ліквідавана ў выніку мабілізацыі ўсёй КП(б)Б на барацьбу за сяўбу і канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва ходам палявых работ з боку ЦК КП(б)Б на чале з т. **Гікало**, што азначае, што ЦК КП(б)Б рашуча ажыцьцяўляе бальшавіцкія мэтады кіраўніцтва, прыстасоўваемыя на ўсіх вучастках сац. будаўніцтва ленінскім ЦК УсеКП(б) і правадыром партыі тав. **Сталіным**.

Пленум патрабуе ад усіх ячэек КП(б)Б гораду і вёскі ўлічыць памылкі і недахопы, выкрытыя ў часе веснавой сяўбы, і на аснове рашэньняў пленуму ЦК КП(б)Б і пастановы ЦК УсеКП(б) ад 5-га ліпеня—арганізаваць бальшавіцкую падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі—«у яшчэ большай меры, чым гэта было ў часе пасеўнай кампаніі, сканцэнтраваць свае сілы на правядзеньні ўборачных работ, як акрэсьліваючых рэзультаты ўсяго с.-г. году, і ў сувязі з гэтым, на справе ўзмацніць увагу да пытаньняў сельскай гаспадаркі» (з пастановы ЦК УсеКП(б). Паставіць у цэнтры ўвагі пытаньні: барацьбы са стратамі, выразнай арганізацыі працы, выдачы натуральнай і грашовай часткі прыбыткаў у даскапалай адпаведнасьці з колькасьцю выпрацаваных кожным калгасьнікам працадзён, выдачы ў часе абмалоту авансаў калгасьнікам у лік натуральнай часткі прыбыткаў, ліквідацыя ўраўнілаўкі. Ад практычнага вырашэньня гэтых асноўных пытаньняў ва ўмовах кожнага калгасу залежаць посьпехі ўборкі.

Ва ўмовах БССР, барацьба за далейшае шпаркае разгортваньне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў і штодзённае кіраўніцтва імі набывае асаблівае палітычнае значэньне. Пленум адзначае, што адной з важнейшых прычын адставаньня ў сяўбе было невыстарчальна канкрэтнае кіраўніцтва раёнамі, калгасамі, саўгасамі. Таму пленум падкрэсьлівае асаблівае значэньне стварэньня рэзкага пераломму ў бок паляпшэньня кіраўніцтва раёнам. Рашаючым у сучасны пэрыяд зьяўляецца веданьне і ўлік асаблівасьці кожнага раёну, калгасу, саўгасу і вёскі і ў адпаведнасьці з гэтым дыфэрэнцыяваньне кіраўніцтва.

Пленум зьвяртае ўвагу ўсіх арганізацый на неабходнасьць цеснага спалучэньня работ па ўборцы з арганізацыяй збожжазагатовак.

Рост індустрыялізацыі і ўмацаваньне СССР на сацыялістычным шляху далі матчымасьць партыі і ўраду пайсьці на зьнішэньне цэнтралізаваных збожжазагатовак і шырока разгарнуць калгасны гандаль.

Гэта патрабуе ад усёй арганізацыі дасканалага ўліку і бязумоўнай ліквідацыі памылак мінулага году з тым, каб свячасова га ўстаноўленыя тэрміны выканаць плян загатовак. Пленум і партактыў напярэдадні супроць мэханічных і ўраўнілаўскіх падыходаў пры давядзеньні плянаў загатовак да раёну, калгасу і вёскі, супроць настрояў апартуністычнага благадушша і самацёку, памятаючы, што рэшткі ліквідуемых капіталістычных клясаў будуць усімі сіламі імкнуцца зрываць выкананьне плянаў загатовак.

Пленум даручае бюро гаркому забясьпечыць глыбокую прапрацоўку плянаў збожжазагатовак на аснове ўліку асаблівасьцяй нашага раёну; у бліжэйшыя дзьве дэкады правесьці строгую праверку ўсяго загатоўчага апарату і ўмацаваць яго вопытнымі праверанымі работнікамі.

Разам з гэтым пленум падкрэсьлівае неабходнасьць спалучэньня ўборкі і збожжазагатовак з падрыхтоўкай і правядзеньнем асеньняй сяўбы і, у прыватнасьці, свячасовага выкананьня плянаў ворыва папару.

Па тым, наколькі партыйныя ячэйкі здолеюць дабіцца арганічнай увязкі свячасовай добраякаснай уборкі з абмалотам збожжа і вывазкай збожжа на загатоўчыя пункты—партыйная арганізацыя будзе меркаваць аб іх рабоце.

Пастанова ЦК УсеКП(б) і пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б аб разгортваньні калгаснага гандлю і вытворчасьці прадметаў шырокага спажываньня мае выключнае значэньне для Менскай партарганізацыі. Аднак, да гэтага часу калгасны гандаль у раёне разгорнут невыстарчальна, прадпрыемствы гораду не разгарнулі бальшавіцкай барацьбы за масавую вытворчасьць прадметаў шырокага спажываньня. Пленум абавязвае кожную парт'ячэйку разьвіць шырокую растлумачальную і палітычную работу ў масах рабочых і калгасьнікаў вакол пытаньня савецкага гандлю, растлумачыць розьніцу паміж гандлем у сучасны момант і ў пэрыяд НЭП'у.

Кожны рабочы, калгасьнік і масы працоўных адпаасобнікаў павінны выразна разумець палітычнае значэньне савецкага гандлю на даным этапе, што зараз на рынку сустракаюцца сацыялістычная прамысловасьць з буйнай сацыялістычнай сельскай гаспадаркай, з калгасьнікам і працоўным аднаасобнікам, што на рынку вядзецца жорсткая барацьба, накіраваная на выкараненьне спэкулянта-перакупшчыка, што калгасны гандаль арганізацыйна-гаспадарча ўмацоўвае калгасы і яшчэ больш павышае матар'яльна-бытавы ўзровень рабочай клясы, калгасьнікаў і працоўных мас.

Пленум Менгаркому даручае кожнай парт ячэйцы распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы і арганізаваць ініцыятыву пралетарскай грамадзкасьці навакол пытаньняў разгортваньня вытворчасьці прадметаў шырокага спажываньня, дапамогі калгасам у пабудове магазынаў, складаў і ларкоў, па культурным абслугоўваньні базараў.

Пленум гаркому даручае бюро гаркому і парт'ячэйкам у бліжэйшыя дні праверыць становішча вырабу тавараў шырокага спажываньня на прадпрыемствах г. Менску.

Каапэрацыйныя арганізацыі на вёсцы адыгрываюць вялікую ролю ў справе разьвіцьця савецкага гандлю і прасоўваньня прадметаў шырокага спажываньня на вёску. Пленум даручае бюро гаркому ў бліжэйшы месяц праверыць работу апаратаў сельспажытаварыстваў, ужыць захады па ўмацаваньні іх кіруючымі і тэхнічнымі работнікамі. Вітаючы пастанову пленуму гаркому аб мабілізацыі 100 камуністаў для работы на вёсцы, пленум даручае бюро гаркому і парт'ячэйкам ажыцьцявіць гэта мэрапрыемства на працягу 2-х бліжэйшых дэкад.

Пастаўленая XVII усесаюзнай канфэрэнцыяй задача пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва ў другой пяцігодцы патрабуе ўмацаваньня ўсіх органаў дыктатуры пралетарыяту.

Адзначаючы наяўнасьць раду выпадкаў трубага парушэньня рэвалюцыйнай законнасьці, перагібаў, адміністраваньня з боку паасобных зьвеньняў апарату і паасобных работнікаў, пленум вітае пастанову ЦК УсеКП(б) і ЦВК СССР аб узмацненьні рэвалюцыйнай законнасьці і абавязвае ўсе ячэйкі ўзмацніць барацьбу з фактамі парушэньня рэвалюцыйнай законнасьці, прыцягваючы да самай суровай адказнасьці вінаватых у гэтых парушэньнях.

Перабудова і разгортваньне арганізацыйна-парт-выхаваўчай і масава-палітычнай работы—рашаючы фактар у ажыцьцяўленьні тых задач, якія на даным этапе стаіць партыя.

Пленум гаркому абавязвае ўсе партарганізацыі, на аснове пастаноў пленуму ЦК, ужыць рашучыя захады па ліквідацыі адставаньня ў пастаноўцы партработы. Ад кожнага парткалектыву і ячэйкі пленум патрабуе канцэнтрацыі ўвагі да пытаньняў: умацаваньня сярэдняга і ніжэйшага партыйнага зьвяна, паляпшэньня зьместу партдня, разгортваньня выхаваўчай работы, асаблівага сярод кандыдатаў партыі і новапрынятых членаў партыі, да разгортваньня масава-палітычнай работы, яе дыфэрэнцыяцыі прыстасоўна да асобных груп і катэгорый рабочых. Ведаць кожнага камуніста, кожнага рабочага і яго запатрабаваньні, павысіць ідэйна-палітычны ўзровень агітацыі—баявы лёзунг для кожнага зьвяна партарганізацыі, для кожнага камуніста.

Абстаноўка сучаснага пэрыяду характарызуецца нябывалым ростам індустрыяльнай магутнасьці СССР і ўмацаваньня СССР на сацыялістычным шляху; гэта выклікае шалёнае супраціўленьне рэшткаў капіталістычных клясаў, якія ліквідуюцца, на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва. Шалёная падрыхтоўка імпэрыялізму да новай вайны, шукаючы выхаду з крызісу, і ў першую чаргу супроць Савецкага саюзу, з асаблівай вострасьцю ставіць перад усёй партарганізацыяй задачу рашучага ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны і пільнай увагі да міжнародных падзей і растлумачэньня іх шырокім рабочым масам.

Прымежнае становішча БССР ускладняе і абвастрае клясавую барацьбу. Задачай усёй КП(б)Б і яе Менскай арганізацыі зьяўляецца — узмацніць клясавую пільнасьць, зламаць супраціўленьне клясавага ворага, узмацніць барацьбу супроць правага «апартунізму» — галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць «левых» загібаў і прымірэнцаў да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі.

Партактыў выказвае цьвёрдую ўпэўненасьць, што пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і Менскага гаркому на чале з тав. Гікало, Менская партарганізацыя сапраўды і хутка аўладае бальшавіцкім стылем у рабоце, апэрацыйнасьцю і канкрэтнасьцю ў кіраўніцтве і з посьпехам выканае задачы, ускладзеныя на яе па ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі.



АГУЛЬНЫ ВЫГЛЯД АМІЯЧНАЙ ГРУППЫ ЗАВОДАЎ БОБРЫКАЎСКАГА ХІМКАМБІНАТУ.

Самазабесьпячэнцы „стараюцца"

У м. **Парычах** пры сельспажытаварыстве ёсьць загатоўчы пункт. Загатоўкі розных продуктаў ідуць добра. Але загатоўшчыкі ўсьлед разбазарваюць загатоўленыя прадукты.

Старшыня райсаюзу Казлоўсі кожны дзень пасылае сваю жонку ў загатоўчы пункт за рознымі продуктамі і яна кожны дзень цягае даной яйкі, масла, трускаўкі і інш.

З «благаслаўленьня» **Казлоўскага** расьцягваюць прадукты з загатоўчага пункту старшыня сельспажытаварыства **Гарзлік Барыс** і загадчык загатоўчага пункту **Хаздан**.

Хаздан працуе бяз усякага кантролю, а таму ўсе прадукты і прамтавары, якія праходзяць праз яго рукі, бесспэрамонна разбазарваюцца. Ён забясьпечвае сябе і ўсіх сваіх знаёмых дэфіцытнымі рэчамі.

Белкаапсаюз даў нашаму сельспажытаварыству заданьне загатовіць **10 тон** трускавак. Але загатоўлена толькі **паўтары тоны, бо цукар, які** адпускаўся на варку трускавак, **разбазараны**. Зараз прыбывае шмат **мануфактуры** на розныя віды загатовак. З упэўненасьцю можна сказаць, што **ня менш 25 проц. гэтых прамтавараў ідуць на самаснабжэньне каапэрацыйных работнікаў і іх знаёмых**.

Хаздан гаспадарыць як хоча, бо яго **ніхто не правярае**. Не правяраюць-жа яго таму, што ён **«свой» чалавек у кампаніі самазабесьпячэнцаў**, да якой адносяцца амаль усе кіраўнікі нашага райсаюзу і сельспажытаварыства.

Трэба з усёй рашучасьцю ўдарыць па самазабесьпячэнцах, якія зрываюць справу таварзвароту, справу рабочага забесьпячэньня.

Сьведка.

НАС ІГНАРУЮЦЬ

(Ліст настаўніцы Сасьнянскай школы)

Я хачу сказаць некалькі слоў аб адносінах **Сьвячанскага** сельсавету, **Бешанковіцкага раёну**, да настаўніцтва і школьнага будаўніцтва наогул.

Кожны настаўнік прымацован да калгасу. Прыходзіцца за 3 клм. хадзіць у калгас. Настаўнік у калгасе неабходны чалавек. Ён там і рахункавод, і брыгадзір, і рэдактар пасьцягазеты. Ён прымае ўдзел у рэўкамісіі, ліквідуе нявысьменнасьць і г. д.

Праца гэта адказная. Мы яе ахвотна выконваем і ганарымся ёю.

Толькі **наш сельсавет** зусім не зварачае ўвагі на нашы справы. Нашы скаргі аб тым, што няма памяшканьня пад клясы, няма кватэр настаўнікам застаюцца бяз усякай увагі.

Таксама і калгасы часта недаацэньваюць нашай работы. Скрозь і ўсюды атрымліваецца, **што настаўнік ня можа купіць у калгасе малака, хлеба і іншых прадуктаў, у той час, як ёсьць пастанова Бежаніцкага цэнтру, у якой ясна сказана, што калгасы павінны дапамагаць настаўнікам прадуктамі.**

Сельсавет махае рукой на школьныя справы.

— **У нас ёсьць больш важныя справы,** — кажа **старшыня** сельсавету, калі да яго зьвяртаюцца за атрыманьнем зарплаты, аплатай рахункаў. — **Нам ня выплачана зарплата на працягу 3-х месяцаў.**

Я прашу «Зьвязду» дапамагчы нам прымусіць Сьвячанскі сельсавет выконваць свае абавязкі перад настаўніцтвам.

Карпава М.

АД РЭДАКЦЫІ: «Зьвязда» зьвяртае ўвагу **Бешанковіцкага інспэктара нарасьветы на факт ігнараваньня настаўніцтва Сьвячанскім сельсаветам** і чакае паведамленьня аб прынятых захадах.

Буднікаў зрывае прафработу

(Ліст рабочага друкарні)

Друкарня **«Сталінскі прызыў» (м. Касьцюковічы)** арганізавана і пушчана ў ход **у чэрвені месяцы 1931 году. Ужо другі год мы працуем без калдагавару.** Рабочыя ня ведаюць, што ім патрэбна і што яны павінны. Наш прафупаўпаважаны **Буднікаў** больш **займаецца лоўляй рыбы**, чым паладжаньнем прафработы ў друкарні. Ён, калі прыходзіць на работу, то заўсёды **ў п'яным выглядзе і лае рабочых.**

За **ўвесь** час існаваньня друкарні **Буднікаў** ні разу не даваў справаздачы перад рабочымі аб яго рабоце.

Буднікаў ня толькі ня можа быць прафупаўпаважаным, а яго трэба **выгнаць з друкарні** наогул. Апрача лаянкі, ён дае волю яшчэ рукам. **Ён зьбіў рабочага Макарэнка Н.** Злаяў апошнімі словамі рабочых яўрэяў **Чорнаморца Х., Пісьмана Ш.**

Наша **ПАРТЫЙНАЯ ЯЧЭЙКА** чамусьці **ня бачыць** бясчынстваў **Буднікава**. Я думаю, што **Касьцюкевіцкі райком** партыі і РПК умяшаюцца ў справу нашай друкарні.

ШЫЛА.

Месячнік штурму зрываецца

(Ліст дзесятніка)

Быхаўскі райвыканком для правядзеньня **месячніка штурму па дарожным будаўніцтве вызначыў раённы штаб.** Гэты штаб зусім не працуе. **Штаб створан толькі для адводу вачэй.**

Члены штабу не прымацаваны да паасобных вучасткаў работы. Нават на тыгульных работах на дарозе за ўвесь час месячніка ня было піводнага прадстаўніка райштабу. Штаб зусім ня цікавіцца правядзеньнем месячніка.

Грамадзкія арганізацыі Быхаўшчыны на чале з РВК лічаць справу правядзеньня месячніка штурму выключна **справай дарожных працаўнікоў.**

Ня гледзячы на шматлікія просьбы працаўнікоў нашай дарогі да **партыйна-камсамольскіх** арганізацый гуты **«Ільліч»** аб дапамозе ў правядзеньні месячніка, нам ніякай дапамогі не аказана.

Сельсаветы таксама бяруць прыклад з раённых арганізацый і сыстэматычна зрываюць правядзеньне месячніка. На нашы просьбы прыняць удзел у правядзеньні месячніка мы атрымліваем адказы:

— Што мы вам дарогу будзем будаваць? Вазьмеце самі людзей ды будуйце.

Да гэтага часу дарожная інспэкцыя **ня мае свайго каня** і работнікам інспэкцыі прыходзіцца хадзіць па раёну пяшком, што ў значнай ступені тармозіць паладжваньне работы па дарожным будаўніцтве.

Раённая газэта **«Маяк камуны»** зусім не асьвятляе ходу месячніка, а калі зьмяшчае асобныя допісы, дык скажае факты, тым самым абяцэньваючы гэтыя допісы.

Месячнік штурму дарожнага будаўніцтва фактычна сарваны. Раённыя арганізацыі не дапамаглі чам выйсьці з прарыву.

ПРОЦКІ.

Аб урэгуляваньні прыгараднага руху

ПАСТАНОВА НАРКОМА РСІ БССР АД 9-VII 32 ГОДУ

1. Прызнаць, што з боку начальніка станцыі Менск МББ чыг. праяўлены ў грубой форме бюракратызм, непаваротлівасьць, няўменьне на ходу перабудаваць сваю работу з тым, каб увесь парадак эксплёатацыі прыгараднага руху прыстасаваць да найлепшага абслугоўваньня працоўных, якія адпачываюць у дамах адпачынку і на дачах, калгасьнікаў і аднаасобнікаў, што вязуць свае прадукты ў Менск па базар і г. д. Гэта выявілася ў тым, што, ня гледзячы на рад сыгналаў у друку, скаргаў працоўных, — дагэтуль ня была павялічана колькасьць кас, не ўстаноўлены дзяжурныя стралкі для аховы парадку, ня прыняты меры да ліквідацыі чаргі ў касах,—за што начальніку станцыі Менск МББ чыг. тав. **Варкулевічу** і начальніку вакзалу тав. **Сафроненка** абвясьціць вымову з заняесьньем у працоўны сьпіс.

2. Пад асабістую адказнасьць нам. начальніка станцыі Менск МББ чыг. т. **РЫМАНА** і начальніка Менскага аддзяленьня Саюзтрансу т. **ГОРНАГА** прапанаваць правесьці ў пяцідзённы тэрмін наступныя мерапрыемствы для паляпшэньня парадку эксплёатацыі прыгараднага руху:

а) устанавіць па г. Менску 6 прыгарадных кас для продажу білетаў па ўсіх напрамках прыгараднага руху, з іх 3 касы ўстанавіць на пляцы каля вакзалу, адну—на гарадзкой станцыі, адну на пляцы Волі і адну ў будынку вакзалу, перадаўшы касіру апошняй касы ўсю работу па выдачы і прыёме катушачных білетаў па ўсёй прыгараднай сетцы.

Тэрмін работ кас устанавіць наступны: 3 касы каля вакзалу працуюць круглыя суткі; каса на пляцу Волі і ў будынку вакзалу — у дзьве зьмены і касы ў гарадзкой станцыі—ад 9 гадз. раніцы да 3 гадзін дня;

б) лічыць неабходным устанавіць парадак продажу білетаў з усіх прыгарадных кас уперад на бліжэйшыя 7 дзён, аб чым тэлеграфна запрасіць згоду начальніка 3-га эксплёатацыйнага раёну;

в) абавязаць нам. начальніка атрадаў вапізаванай аховы ст. Менск МББ чыг. т. **АЛЯКСАНДРАВА** неадкладна ўстанавіць кругласутачныя дзяжурствы стралкоў у прыгарадных касах для аховы парадку. Адначасова прасіць Менгарсавет аб устанаўленьні міліцэйскіх пастоў каля гарадзкіх кас;

г) у пяцідзённы тэрмін высьветліць магчымасьць падачы цягнікоў Менск—Радашковічы для высадкі і пасадкі да пэрону вакзалу, пры немагчымасьці-ж выканаць гэта—устанавіць пастаянны праход пасажыраў з правага боку вакзалу каля пантоннага аддзяленьня;

д) спрасьціць парадак выдачы сэзонных і месячных праязных білетаў, дабіўшыся афармленьня іх выдачы ў той-жа дзень;

е) месца і час работы прыгарадных кас і парадак атрыманьня сэзонных білетаў папулярызаваць шляхам абвестак на працягу 3-х дзён ва ўсіх цэнтральных газэтах БССР;

ж) даручыць начальніку Аршанскага эксплёатацыйнага раёну ў пяцідзённы тэрмін абгаварыць і даць свае меркаваньне па сутнасьці прапаноў, высунутых у артыкуле «Зьвязды» ад 28-VI-32 г. за № 143 аб зьмене раскладу цягнікоў Менск—Радашковічы;

з) транспартнай групе НК-РСІ БССР праз 5 дзён праверыць выкананьне гэтай пастановы і далажыць мне.

Нам. наркома РСІ БССР ГУРЭВІЧ.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Бальшавіцкае прывітаньне выпускніком курсаў райпартактыву!

Да 2-га выпуску курсаў райпартактыву

У агульнай сыстэме перабудовы работы партыйных арганізацый, у разгортваньні арганізацыйнай партыйна-выхаваўчай і масава палітычнай работы пытаньне кадраў адыгрывае адну з рашаючых ролей. За апошнія гады кадры кіруючых партыйных работнікаў у КП(б)Б надзвычай вырасьлі колькасна, узбагацілі вопыт партыйнай работы новымі ведамі, яшчэ больш загартавалі сваю ідэйную стойкасьць. Гэта бясспрэчны факт.

Але тыя задачы, якія зараз ставіць партыя ў галіне перабудовы партыйна-масавай работы, патрабуюць узмацненьня падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў партыйных работнікаў. Бо наяўная колькасьць кадраў усё яшчэ поўнасьцю ня можа задаволіць тых запатрабаваньняў, якія вымагаюцца задачамі, пастаўленымі партыяй. І нашай задачай зьяўляецца падрыхтоўваць новыя кадры кіруючых работнікаў з ліку тых ударнікаў пяцігодкі, якія прышлі нядаўна ў нашу партыю. «Наша задача заключаецца ў тым, каб мы выкарысталі той вялізарнейшы рэзэрв сіл, які ў нас ёсьць» (Кагановіч).

ЦК КП(б)Б заўсёды аддаваў і аддае вялікую ўвагу справе падрыхтоўкі кадраў. Летась пры Цэнтральным Камітэце КП(б)Б былі арганізаваны курсы партыйнага актыву. Гэтыя курсы, работа якіх разьлічана на пасьцімесячны тэрмін, ужо змаглі даць КП(б)Б значныя кадры ўзброеных марксыцка-ленінскай тэорыяй работнікаў.

Курсы існуюць год. Яны ўжо даюць другі выпуск слухачоў. Гэты другі выпуск робіцца сёньня, калі ліпеньскі пленум ЦК і ЦКК паставіў перад КП(б)Б надзвычай адказныя задачы па правядзеньні ўборачнай кампаніі, па разгортваньні калгаснага гандлю і вырабу прадметаў шырокага спажываньня, па перабудове арганізацыйнай партыйна-выхаваўчай і масавай работы. Гэтымі задачамі на выпускнікоў ускладаюцца надзвычай вялікія абавязкі.

175 слухачоў курсаў райпартактыву сёньня ідуць на практычную работу. Хто гэтыя 175 чал.? Больш 70 проц. іх агульнай колькасьці па сваім сацыяльным становішчы рабочыя, пераважная колькасьць іх маюць 4-5 гадовы партыйны стаж.

Задача выпускнікоў — свае марксыцка-ленінскія веды, атрыманыя на курсах, дастасаваць на практыцы сацыялістычнага будаўніцтва ў горадзе і на вёсцы. А гэтыя веды значныя. Даволі ўказаць на тое, што слухачы ў асноўным справіліся з асваеньнем вызначанай праграмы, у якой вялікае месца было адведзена такім дысцыплінам, як палітэканомія, эканомпалітыка, асновы марксізму-ленінізму і асновы тэхнікі.

Уся работа на курсах была пабудавана па функцыянальным прынцыпе. На курсах было 8 функцыянальных груп: сакратароў апорных сельячэек, кіруючых партработнікаў, загадчыкаў аргаддзелаў, сакратароў вытворчых парткалектываў, агітмасавых работнікаў, прапагандыстаў, шацменработнікаў і работнікаў бальшавіцкага друку.

Слухачы сваю тэарытычную вучобу, на курсах увязвалі з практыкай сацыялістычнага будаўніцтва. У прыватнасьці, яны актыўны ўдзел прымалі ў пасеўнай кампаніі, у перабудове партыйнай работы на вёсцы, у вярбоўцы рабочай сілы на лесазагатоўкі.

Пасьля курсаў вызначаецца: да 50 таварышоў накіраваць на работу ў якасьці сакратароў апорных партыйных ячэек на вёсцы, каля 25 таварышоў сакратарамі цэхавых ячэек, да 40 чалавек на раённую кіруючую работу, пераважна на арганізацыйную і агітмасавую. Гэта паказвае, што слухачы на курсах атрымалі досыць вялікія веды.

Задачай выпускнікоў зьяўляецца зараз-жа пасьля прыбыцьця на месца адразу-ж набальшавіцку ўзяцца за перабудову партыйнай работы, за ажыцьцяўленьне пастаноў ліпеньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б. На практычнай рабоце, на якім-бы вучастку той ці іншы таварыш не знаходзіўся, неабходна мабілізаваць масы на выкананьне праграмы 4-га заключнага году пяцігодкі, на падрыхтоўку да другога пяцігодзьдзя пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Будучы на практычнай рабоце, выпускнікі павінны няўхільна мабілізоўваць членаў партыі на барацьбу супроць правага апартунізму — галоўнай небясьпекі на даным этапе, «лявацкіх» загібаў, супроць прымірэнцаў да ўхілаў ад лініі партыі.

Няма пікага сумненьня ў тым, што задачы, ускладзеныя на курсантаў пры іх выпуску, будуць з гонарам выкананы, што яны акажуць вялікую дапамогу партыйным арганізацыям у барацьбе за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

Ал. Макоўскі.

Прывітаньне выпускніком ад ЦК КП(б)Б

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б шле гарачае прывітаньне 175 выпускніком курсаў кіруючага раённага партыйнага актыву.

ЦК ўпэўнен, што выпускнікі, узброіўшыся марксыцка-ленінскай тэорыяй, пакажуць сапраўдныя прыклады бальшавіцкага змаганьня за ажыцьцяўленьне чарговых гаспадарча-палітычных задач, пакажуць як на справе трэба перабудоўваць партыйна-масавую работу, узмацняць яе тэмпы і якасьць.

Уперад да новых перамог, за пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва!

Сакратар ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ.

Курсанты аб сваёй вучобе



Да курсаў я працавала сакратаром партыйнага калектыву. З 1917 году лічуся членам прафэсіянальнага саюзу. У члены КП(б)Б уступіла ў 1926 г. 8 год працавала на прадпрыемствах (фабрыка папярос, піваварны завод і інш.). Мая агульная адукацыя — дзьве групы вячэрняй рабочай школы, палітычная — аднагадовая вячэрняя саўпартшкола першай ступені.

Ясна, што пры такой падрыхтоўцы працаваць сакратаром калектыву было ня лёгка. І мяне паслалі на курсы райпартактыву. За 6 месяцаў я атрымала шмат як у галіне аўладаньня марксыцка-ленінскай тэорыяй, так і вопытам партыйнай работы.

Спадзяюся, што мне ўдасца іх дастасаваць на практычнай рабоце, што, узброіўшыся марксыцка-ленінскай тэорыяй, з большым посьпехам буду змагацца за ажыцьцяўленьне тых гаспадарча-палітычных задач, якія на даным этапе ставіць партыя.

Б. І. Бэрына.

* * *

З 1923 году я працаваў у камсамоле. У партыю ўступіў у 1926 годзе. Па сацыяльным становішчы—батрак. Раней працаваў па найму ў кулацкіх гаспадарках.

Апошні пэрыяд перад курсамі быў сакратаром апорнай парт'ячэйкі. Скончыў 3 групы вясковай школы. Па палітычных прадметах займаўся самаадукацыяй.

Зараз пасьля вучобы па курсах адчуваю, што мой кругавід пашырыўся, што я маю пэўны запас палітычных і агульных ведаў. Зараз і на практычнай рабоце я змагу лепш працаваць па ажыцьцяўленьні дырэктыў нашай партыі.

А. Юшкевіч.



Уступіла я ў партыю ў 1926 годзе. Па сацыяльным становішчы—работніца, па прафэсіі—краўчыха. Апрача месячных курсаў жанарганізатараў я нідзе ня вучылася. Працавала да курсаў райпартактыву жанарганізатарам.

Зараз я атрымала значныя веды ня толькі па палітычных прадметах, але і агульна-адукацыйных. Знаходзячыся ў калектыве партыйных работнікаў, будучы на практыцы я здабыла значныя веды ў галіне вопыту партыйна-масавай работы. Гэта ўсё дазволіць мне працаваць з большай прадукцыйнасьцю і даць больш карысьці для нашай партыі.

С. Д. Хількевіч.

* * *

У 1918 годзе я ўступіў у члены партыі. Увесь час працаваў на нізавой партыйнай рабоце. Працаваць было цяжка, бо я меў толькі ніжэйшую адукацыю. Да пасылкі на курсы працаваў намесьнікам старшыні райкалгассаюзу. Вось на гэтай рабоце я асабліва адчуваў патрэбу ў тэарытычных ведах. На курсах гэтыя веды я атрымаў.

Пайшоўшы на практычную работу, здолею з большым посьпехам, чым да курсаў змагацца за ажыцьцяўленьне задач партыі па сацыялістычным будаўніцтве, за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі ў тэорыі і на практыцы.

М. Ярышаў.

Выпускнікі: Макелаў і Бухман.

АДЗІНЫ ШЛЯХ ДА САЦЫЯЛЬНАГА І НАЦЫЯНАЛЬНАГА ВЫЗВАЛЕНЬНЯ—ШЛЯХ ПРАЛЕТАРАЎ БССР

З АДОЗВЫ Б. ПАСЛОЎ ПОЛЬСКАГА СОЙМУ Т.Т. МЯТЛЫ І РАК-МІХАЙЛОЎСКАГА і Б. САКРАТАРА ГРАМАДЫ Т. БУРСЭВІЧА

Таварышы! Дванаццаць год таму назад пад напорам непераможнай Чырвонай арміі, пад кіраўніцтвам ленінскай партыі бальшавікоў, пад ударамі бясстрашных партызанскіх атрадаў адступала ў паніцы армія Пілсудзкага.

Жудасны сьлед пакідалі за сабой белапалякі: дымяліся падпаленыя гарады і вёскі, на дрэвах гойдаліся целы павешаных рабочых і сялян, несьліся стогны, крыкі, плач.

Гэта—шлях польскіх легіёнаў. Яны, адступаючы, з гонарам выконвалі загад свайго правадыра: «Дзе ступіў бот польскага салдата, там трава не расьце».

Мінула дванаццаць гадоў. Сьляды акупацыйнай арміі ня толькі зарасьлі травой. Сёньня там, дзе ў 20-м годзе дымяліся руіны гарадоў, горда ўздымаюцца карпусы гігантаў-заводаў, там, дзе дратаваў гоні ўланскі конь—буйна красуюцца калгасныя нівы.

Там, дзе калісьці высяліся гордыя памешчыцкія маёнткі, сёньня разьвіваюцца калгасы, камуны, саўгасы.

На падставе росквіту эканомікі краіны, магчымага толькі дзякуючы **ленінскаму выраішэньню нацыянальнага пытаньня,** — разгортваецца культурная рэвалюцыя.

Разгорнутым бальшавіцкім штурмам ліквідавана чорная спадчына царызму—цемра, няпісьменнасьць. **1932 год сустракае Савецкая Беларусь краінай суцэльнай пісьменнасьці.**

З кожным днём узрастае дабрабыт працоўных і іх культурны ўзровень. Газэта, кніжка—сталі незбходнасьцю, штодзённым хлебам. Узрос да некалькіх мільёнаў тыраж газэт, часопісяў, кніжак. Натлядаецца нябачаны росквіт пралетарскага мастацтва, асабліва літаратуры.

Так будуецца беларуская культура, нацыянальная па форме і сацыялістычная па зьмесьце, даказваючы на справе ўсю правату слоў правадыра партыі тав. Сталіна, што «эпоха дыктатуры пралетарыяту ёсьць эпоха буйнага росквіту нацыянальных культур».

А што робіцца там, за недалёкай мяжой, у Заходняй Беларусі, якой давялося астацца пад уладай белапольскіх акупантаў?

Чорныя дні плывуць над Заходняй Беларусьсю. Палітыка акупантаў давяла яе да руіны. Замараюць прамысловыя цэнтры, бес працоўе, драпежніцкая эксплёатацыя, голад рабочых, голад зямлі, паншчына і падаткі душаць селяніна, пошасьць хвароб, а ў вачох галодная сьмерць; нацыянальны ўціск і гвалтоўная палёнізацыя, як «выраішэньне» нацыянальнага пытаньня,—вось выпікі дванаццацігадовага пад'ярэмнага жыцьця Заходняй Беларусі.

У той час, як у **Гомелі** адбудаваны і пэацуе з поўнай нагрузкай вялізарны машынабудаўнічы завод «Гомсельмаш»—у тэкстыльным **Беластоку** крызіс **спыняе** апошнія фабрыкі. Беласток—калісьці жывы, бурлівы прамысловы цэнтр Заходняй Беларусі, **нагадвае цяпер мёртвы горад.** Тады, як у **Крычаве,** над Сожам, вырас гігантычны цэмэнтны завод, запалёўшы свае печы,—у **Баранавічах** пабудавана па апошнім слове тэхнікі... **турма.**

У той час, калі на шырокіх калгасных палёх працуюць тысячы сталёвых коняй—трактараў, калі на нівах Савецкай Беларусі зьвіўся камбайн—там, на падняволеных гонях Заходняй Беларусі, абакрадзены акупантамі селянін перайшоў да дзедаўскай сахі.

У той час, калі ў БССР шпаркім тэмпам будуецца пралетарская культура, у Заходняй Беларусі акупанты душаць мізэрныя рэшткі беларускага школьніцтва. Разграмляецца ТБШ, ліквідуюцца дзьве апошнія беларускія гімназіі ў Вільні і Навагрудку.

Сотні тысяч беспрацоўных у Заходняй Беларусі і ніводнага беспрацоўнага ў БССР; ні аднэй сапраўды беларускай школы там, і тысячы сямігодак, тэхнікумаў, інстытутаў тут, паралiжаваньне працы ТБШ з мэтай канчатковай ліквідацыі яе і—Акадэмія навук у Менску,—**вось кантрасты, якія няўхільна паўстаюць перад кожным рабочым і селянінам акупаванай Заходняй Беларусі, паўстаюць, прымушаючы задумацца і зрабіць вывад!**

І працоўныя Заходняй Беларусі робяць вывад: ісьці па шляху рабочых і сялян БССР. **Іншага выхаду няма і ня можа быць.**

Нацыянальна-вызваленчы рух, накіраваны сваім лёзам супроць польскага імпэрыялізму, расьце і магутнее ў баёх з акупантамі, а таксама ў бязьлітаснай барацьбе з падрыўшчыкамі і здраднікамі гэтых баёў — з беларускай буржуазіяй і кулацтвам, з беларускім нацыянал-фашызмам.

Усе гэтыя Луцкевічы і Астроўскія — беларускія нацыянал-фашысты — ніхто іншы, як тыя-ж самыя нацыянал дэмакраты ў БССР. Менскія нацыянал-дэмакраты і віленскія нацыянал-фашысты — адна сямейка. Як адны, так і другія чакалі буржуазнага перараджэньня Савецкай Беларусі. Як адны, так і другія расчараваліся ў сваіх лятуценьных, якія разьбіліся аб генэральную лінію партыі ў справе **індустрыялізацыі БССР,** аб пасьпяховую **сацыялістычную рэканструкцыю** народнай гаспадаркі і **разьвіцьцё пралетарскай культуры.**

Чарговы этап аб'яднаў падпэмаў з пацфашыстамі супольнай працай па актыўнай падрыхтоўцы антысавецкай **інтэрвэнцыі.** Нацыянал-дэмакратаў выкрылі органы пралетарскай дыктатуры, паказаўшы іх рабоча-сялянскім масам на ўсёй красе здрадніцкаў, лёкаяў польскага і міжнароднага імпэрыялізму. Інтэрвэнцыяністкую сутнасьць нацыянал-фашыстаў дэмаскую на кожным кроку КПЗБ, а дзень, калі іх рэвалюцыя пакліча на суд—**недалёкі.**

Таварышы!

Сьвяткуючы 12-ю гадавіну вызваленьня Савецкай Беларусі ад белапалякаў, мы з усёй рашучасьцю павінны сказаць: **«польскі імпэрыялізм не перастаў лятуцець аб межах 1772 году.** Памешчыкам і фабрыкантам не пераставі яшчэ мярэшчыцца цёплыя князьдзечкі, разьнесеныя кастрычніцкім шквалам.

Пілсудзкі хоча паправіць 1920 год. Буржуазія прагне крывавай вайны. Іншага выхаду з крызісу і ў жаху перад нарастаючай рэвалюцыйнай хваляй буржуазія ня бачыць.

Таму з такім дзікім запалам і смакам польскі фашызм душыць у Заходняй Беларусі кожнае найменшае праяўленьне антыакупацыйнай барацьбы.

Працоўныя Савецкай Беларусі, у радасны дзень вызваленьня — вышэй хвалю творчага энтузіязму! Ударым па інтэрвэнтах узьнятым тэмпам сацыялістычнага будаўніцтва, узмацненьнем абароназдольнасьці краіны!

Далоў акупацыю Заходняй Беларусі!

Далоў агентаў польскага фашысцкага ўраду—беларускіх нацыянал-фашыстаў!

Няхай жыве права на самавызначэньне Заходняй Беларусі аж да аддзяленьня ад Польшчы!

Няхай жыве пралетарская рэвалюцыя ў Польшчы, вызваляючая рабочых і працоўнае сялянства ад сацыяльнага і нацыянальнага гнёту!

Няхай жыве камуністычная партыя Польшчы, камуністычная партыя Заходняй Беларусі і камуністычная партыя Заходняй Украіны — кіраўнікі і арганізатары рэвалюцыйных баёў за дыктатуру пралетарыяту ў Польшчы!

Проч імпэрыялістычную антысавецкую падрыхтоўку вайны польскім фашызмам!

Няхай жыве вольная Савецкая Беларусь!

Былыя дэпутаты польскага сойму:
Петра Мятла, Сымон Рак-Міхайлоўскі.
Сакратар «Грамады» — **Бурсэвіч М.**

ОРДЭН ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЬЦЯГУ ГЕРОЯМ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ І САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ БУДОЎЛІ

Пастанова прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР, у адзнаку 12-й гадавіны вызваленьня Беларускай ССР ад белапалякаў, пастанаўляе:

Узнагарадзіць ордэнам Працоўнага Чырвонага Сьцягу БССР наступных актыўных удзельнікаў вызваленьня Беларускай ССР ад белапалякаў і лепшых змагароў сацыялістычнага будаўніцтва:

1. **Ляўкова** Максіма Архіпавіча—аднаго з баявых кіраўнікоў партызанскага руху БССР па вызваленьні Беларусі ад белапалякаў за актыўны ўдзел у змаганьні за сацыялістычнае будаўніцтва.

2. **Олікера,** доктара,—за актыўную барацьбу ў часе грамадзянскай вайны з белапалякамі і актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве.

3. **Рудкоўскую** Серафіму, работніцу—за актыўную барацьбу ў часе грамадзянскай вайны з белапалякамі.

4. **Гарэлік** Надзю, работніцу,—за актыўную барацьбу ў часе грамадзянскай вайны з белапалякамі.

5. **Сіманоўскага** Цінуса Шоламава—за ўдзел у барацьбе супроць белапалякаў на Заходнім фронце ў часе грамадзянскай вайны, за ўдзел у ліквідацыі бандаў.

6. **Шапіра** Натана Еўпавіча, рабочага бракоўшчыка,—за ўдзел у барацьбе супроць белапалякаў на Заходнім фронце ў часе грамадзянскай вайны і ліквідацыю банды Гадака.

7. **Ламаносава** Базыля Рыгоравіча—за ўдзел у барацьбе на эстонскім фронце супроць белаэстонцаў і балахоўцаў, за ўдзел у ліквідацыі савінкаўскіх бандыцкіх атрадаў.

8. **Сіекса** Альбэрта Якаўлевіча,—за ўдзел у грамадзянскай вайне на Паўночным фронце супроць англічан і на Заходнім фронце супроць белапалякаў.

9. **Байко** Ігната Якубава—за актыўны ўдзел у барацьбе супроць белапалякаў у часе грамадзянскай вайны, стойкага і адданага барацьбіта за справу рабочай клясы, аднаго з актыўных арганізатараў калгасаў на Старобіншчыне, змагара за трэцюю бальшавіцкую вясну.

10. **Бадуновіча,** рабочага заводу «Чырвоны мэталіст»,—за актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве, за актыўны ўдзел у грамадзянскай вайне на Заходнім фронце.

11. **Хімакова** Янку Арцёмава, рабочага, у сучасны момант працуе на заводзе імя Ланцуцкага (Гомель), героя працы—за актыўны ўдзел у рэвалюцыйным руху, за ўдзел у барацьбе з белапалякамі ў часе грамадзянскай вайны, за бальшавіцкае змаганьне за выкананьне прамфінпляну.

12. **Казлоўскага,** Казіміра Казіміравіча, сьлёсара Гомельскай электрастанцыі, вытворчы стаж 33 гады,—за актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве.

13. **Касьпяровіча** Пятра Сямёнавіча, з сялян-беднякоў, спэцыяліста-агранома, дырэктара саўгасу імя Чарвякова, вытворчы стаж 27 год,—за рад рацыяналізатарскіх прапаноў і адданасьць справе сацыялістычнага будаўніцтва.

14. **Пуцькалеву** Фіму, сьвінарку саўгасу «Вусьце», вытворчы стаж 10 год, лепшую ўдарніцу, якая ўнесла некалькі рацыяналізатарскіх прапаноў па захаваньні маладняка, застрэльшчыцу ўвядзеньня прэміяльна-прагрэсыўнай вызелькшчыны ў калгасе — за перавыкананьне норм выпрацоўкі на 35-40 проц., за ўзорную пастаноўку работы свайго сьвінарніка.

15. **Сарокіна** Станіслава Станіслававіча, рабочага, працоўчага на заводзе імя Домбаля ў г. Барысаве, канструктара-рацыяналізатара, якім праведзены рад рацыяналізатарскіх прапаноў, што далі вялікую эфэктыўнасьць заводу. За апошні час т. Сарокін на заводзе сканструяваў машыну, даўшую эканоміі 15.000 руб. у год, актыўнага ўдзельніка грамадзянскай вайны на беларускім фронце.

16. **Рэвекко**—чырвонага партызана—за актыўны ўдзел у партызанскім руху і барацьбе за вызваленьне БССР ад белапалякаў.

17. **Вайчука** Рувіма Барысавіча, рабочага заводу «Бальшавік», ударніка, вытворчы стаж 22 гады,—за прыкладную адданую барацьбу па выкананьні прамфінпляну, за ўмелую і ўдарную арганізацыю масава-палітычнай работы сярод рабочых хромавага цэху.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. ГНІЛЯКЕВІЧ.**
11 ліпеня 1932 г.
г. Менск.

ПАПРАУКА

У артыкуле «Партызаны», зьмешчаным на 3 старонцы «Зьвязды» № 154 ад 11 ліпеня, канец 2-га абзацу 4-ай калёнкі трэба чытаць так: «Пад кіраўніцтвам партыі перамаглі мы на франтох грамадзянскай вайны, пад яе кіраўніцтвам і пабудуем бясклясавае грамадзтва,—так гаворыць былы партызаны».

СЬПІС

дакладчыкаў, вызначаных менгаркомам КП(б)Б для прапрацоўкі вынікаў ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК і чэрвеньскага пленуму ГК і ГКК КП(б)Б

Галадзед (СНК)—завод «Бальшавік», Шаранговіч (ЦК)—завод «Камунар», Грысевіч (Наркамлёгпрам)—(з-д Варапылава, Бенэк (СНК) —ф-ка «Акцябр», Шпэктараў (ГК)—абутковая ф-ка, Грыцкевіч (ГК)—завод Молатава, Чарвякоў (ЦВК)—«Полымя рэвалюцыі», Плешакоў (ЦСПСВ)—цята, Тамашэвіч (ЦК)—Падзіў 7, Амбражунас (Наркамцяжпр.)—М. Р. В., Верба (БКС)—эксплёатацыя, Саевіч (Гістпарт)—полк ДПУ, Кеніг (ГКК)—друкарня імя Сталіна, Рачыцкі (НКЗем—«Камунарка», Агульнік (Камвуз)—«8 сакавіка», Хаскін (БРС)—Белдзяржбуд, Каменштэйн (НКСнаб)—кушнерная ф-ка, Хацкевіч (НКФін)—хлебазавод, Балабанаў (ЦК)—з-д «Беларусь», Паніматка (НКЗем—ф-ка ім. Крупскай, Дунец («Акцябр»)—шчотачная ф-ка, Курнік (ЦК) — Мясакамбінат, Шулькін (ГСПС)—гума, Ошэраў (БАН)—Белкустпрамсаюз, Эпштэйн (БІМЗО)—з-д «Пралетары», Канаплін (Савбуд)—з-д «Ударнік», Жукаў (БІМЗО) — Хэмфармзавод, Кавалёў (ЦСПСВ)—«Чырв. Тэкст.», Куліненко (ГКК) —«Чырв. Хэмік», Каранеўскі (гарсавет)—ф-ка «Усход», Ракаў (Савбуд)—лямцавая ф-ка, Каранеўскі (БАН)—Электрастанцыя, Сухапава (ЦКК)—Уціль, Клімковіч (ЦСПСВ)—Вадакналтрэст, Раманчук (ДВБ)—харчавікі, Левін (ЦСПСВ)—ВСІКА, Валцін (НКСнаб)—Гаржыл саюз, Валодзько (гарсавет)—Менбуд, Васкабой нікаў—УНР-41, Серафімаў (БАН)—Транспартрэст, Дубіна (Нарсувязь)—Дом Ураду, Цэнцыпер (НКЗдраў)—Саюзтранс, Бондар (СНК) —«Беларуска», Кудраеў (ГСПС)—Цэц, Капуцікі («Сав. Бел.»)—Сьпіртзавод, Гурло (П. Э. І.) —абутковая майст. гарсавету.

РЭЗЭРВ:

Засьценкер і Левін (Камвуз); Каржаневіч, Вашмачнікаў (ГК КП(б); Бараўёўскі (ВКС); Кухаркін, Сьвярдлова, Рохкінд (ЦК); Шастакоў («Сав. Бел.»), Кейлін (Дзяржбанк), Эгле (НКШ Зносін).

Сакратарам парткалектываў, ячэек КП(б)Б дагаварыцца з вылучанымі дакладчыкамі аб часе і месцы праведзеньня сходаў.

Менгарком КП(б)Б.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Агітмасавы аддзел ЦК КП(б)Б склікае 13 ліпеня, у 5 гадз. веч. (пакой 43)

НАРАДУ па пытаньні аб арганізацыі агляду работы сельпо. Яўка наступных таварышоў абавязкова: Андрэсенка, Каструлеў, Фальмовіч, (Белкаапсаюз), Матусевіч, Каменштэйн, Красоўскі. Стрэле, прадстаўнікі цэнтральных газэт, дзяржбанку, райпо, ЦСПСВ, ЦП саюзу работнікаў кааперацыі і дзяржгандлю.

МОП-АКТЫУ
НА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ ЗЬЛЁТ ДЛЯ ЗАКЛЮЧЭНЬНЯ САЮЗУ
Прыбывае дэлегацыя ЦК МОПР УССР і ХАРКАЎСКАГА ГК МОПР'у.
13-га ліпеня 6 гадз. вечара
У летнім тэатры «Прафінтэрн»
Цэнтральны Камітэт і Менскі Гарадзкі Камітэт МОПР'у
АРГАНІЗУЮЦЬ
ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ ЗЬЛЁТ МОПРАЎЦАЎ,
прысьвечаны заключэньню саюзу з Харкаўскім ГК МОПР'у наследшую падрахтоўку да 10-гадзьдзя МОПР'у і сусьветнага конгресу МОПР.
Пасьля дакладу і заключэньня саюзу,—вялікая настаўная частка сілы «МЮЗІК-ХОЛ» Менскі МОПР'у атрымліваюць білеты ў ГК МОПР'у штодзенна з 10 да 3х і з 7 да 9 гадз. вечара.

Летні тэатр саду „ПРАФІНТЭРН"
З 8-га ліпеня зусім абновленая праграма
3-га ЦЫКЛЮ эстрадна-цыркавых паказаў
МЮЗІК-ХОЛ у 2-х аддз.
Пачатак у 9 гадз. веч.

13-14 ліпеня г. г., у клюбе Розы Люксэмбург (рог вул. К. Маркса Урыцкага)
Гастролі Масноўскага дзяржаўнага латыскага тэатру «Skatuve»
У рэпэртуары
РАЗЛОМ— у 4 дзеях Б. Лаўрэнева.
ЗЯРНО—у 6 карцінах па Н. Еліну.
Пачатак у 8 г. вечара.

«ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» Пач. 9, 7-30, 9, 10-30 — Новы мастацкі фільм БДК ХТОЯНА (Вораг каля парогу)
„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" — Новы мастацкі фільм БДК ГОНАР Звыш прагрм. хроніка Саюзкіно.
„Пралетары" — Мастацкі фільм АСАБІСТАЯ СПРАВА Звыш прагрм. хроніка Саюзкіно
„СПАРТАК" Пач.: 6, 7-45, 9-30, 11 г. Каса—з 5 г. — Мастацкі фільм ЛЯСНАЯ БЫЛЬ драма ў 8 частках.

Інстытут вядэраўленьня і арганізацыі працы
ПАВЕДАМЛЯЕ, што 13-VII—32 г., у 6 гадзін веч. адбудзецца чарговае
ПАШЫРАНАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ САВЕТУ ІНСТЫТУТУ,
на якое запрашаюцца фабзаўкомы, мэдпункты, страхпункты.
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Аб 2-ой пяцігодцы інстытуту.
2. Справаздача аб дзейнасьці Інстытуту за першае паўгодзьдзе.
3. План працы на III-ці квартал.
Пасяджэньне адбудзецца ў памяшканьні інстытуту (Чырвонаармейская, 16, 3-ці паверх).
Яўка членаў савету абавязкова.
Дырэкцыя.

Ячэйка КП(б)Б. мясцком і адміністрацыя кіраўніцтва ўпаўнаважанага Наркамцяжпраму СССР пры СНК БССР выказваюць сваё глыбокае спачуваньне дырэктару беларускага геалёга-разьведачнага кіраўніцтва тав. ЛУЧЫШЫНУ, з прычыны сьмерці яго дачкі
ТАМАРЫ.

ГЕРАІЧНАЯ БАРАЦЬБА БЭЛЬГІЙСКІХ ГАРНЯКОЎ

УСЯ КРАІНА ПАД ПАГРОЗАЙ УСЕАГУЛЬНАЙ ЗАБАСТОЎКІ

ПАРЫЖ. З Бруселя паведамляюць, што забастовачны рух у Бельгіі хутка разрастаецца, захопліваючы новыя раёны. У сучасны момант бастуе каля 50 тыс. гарнякоў у БОРЫНАЖЫ, у цэнтральным раёне і Шарлеруа. Да руху далучылася некалькі тысяч рабочых мэталюргічных, керамічных, будаўнічых і іншых прадпрыемстваў.

Двухтысячная дэманстрацыя забастоўшчыкаў Борынажу, прыбыўшы ў Лалув'ер (галоўны пункт цэнтральнага раёну) прымусіла далучыцца да забастоўкі таксама рабочых буйнай фаянсавай фабрыкі «Кераміс» і буйнага мэталязаводу «Боэль».

Спынілі працу таксама прамысловыя прадпрыемствы раёну.

Пасьля Лалув'ер бастуючыя з беспрацоўнымі накіраваліся ў басэйн Шарлеруа. Пасьля іх прыбыцьця туды спынілася работа на ўсіх капальнях басэйну, а таксама на радзе мэталя заводаў. Згодна паведамленьня «ЮМАНІТЭ», У РАДЗЕ ПУНКТАЎ БАСТУЮЧЫЯ ЗАХОПЛІВАЮЦЬ РУДНІЧНЫЯ КІРАЎНІЦТВЫ. НА КАПАЛЬНЯХ «ПРОДЗІОІ» АДМІНІСТРАЦЫЯ АРЫШТАВАНА ГАРНЯКАМІ. Бастуючыя пікетуюць усе подступы да капальняў, адбіваючы малейшыя спробы штрайкбрэхерства.

Бэльгійскі ўрад ужывае супроць рабочых шырокія рэпрэсіўныя меры. У РАЁНЫ ЗАБАСТОЎКІ НАКІРАВАНЫ ЗНАЧНЫЯ СІЛЫ ЖАНДАРМЭРЫІ. У Шарлеруа чакаецца прыбыцьцё войск. У міністэрстве ўнутраных спраў адбыліся нарады з удзелам ваеннага міністра і шэфа жандараў.

9-га ўвечары па захопленым рухам раёне хадзілі бранявікі. Каля Шарлеруа бастуючыя рабочыя пабудавалі барыкады з тэлефонных слупоў і спалілі палац дырэктара «Праві дэнс». Барыкады перашкодзілі пажарным прыбыць на месца пажару. Жандармэрыя ў баявой гатоўнасьці. Зноў былі выпадкі страляніны.

У Лалув'еры (вугальны горад у Бэльгіі) забаставаўшыя гарнякі правялі даволі вялікую дэманстрацыю, у якой прымала ўдзел шмат жонак рабочых. Буйным сілам жандармэрыі ледзь удалося разагнаць дэманстрантаў.

* * *

ПАРЫЖ. «Юманіта» паведамляе, што ўрад пачынае ажыцьцяўляць свае пагрозы. У Монс і Шарлеруа накіраваны кавалерыйскія часьці. Кавалерыя кінута таксама і супроць гарнякоў цэнтральнага басэйну. 9 ліпеня жандармэрыя, паліцыя і войскі адкрылі ў радзе пунктаў актыўныя дзеяньні супроць бастуючых. У Марш'ен, Шарлеруа, Дампрэмі, Лалув'ер, Пероні, Карэньен, Удэн і іншых мясцох налічваюцца дзесяткі параненых рабочых; жыцьцю некаторых з іх пагражае небясьпека. Бастуючыя аказвалі нападаючым моцнае супраціўленьне, будавалі барыкады, як напрыклад, у Шарлеруа. Ва ўсім раёне Зно ўведзена асадное становішча.

Камуністы і рэвалюцыйная прафапазыцыя прымаюць актыўны ўдзел у руху. Асабліва важную арганізатарскую і агітацыйную ролю адыгрывае забастовачны бюлетэнь, які выдаецца камуністамі і рэвалюцыйнай прафарганізацыяй. Кандэпутат Жакмот і рад іншых работнікаў партыі ўзначальваюць рабочыя дэманстрацыі ў цэнтральным раёне, ў Шарлеруа, а таксама ў Льежы.

10 ліпеня праведзен вобыск у памяшканьні цэнтральнага камітэту кампартыі ў Брусэлі.

ЯПОНСКІЯ ІНТЭРВЭНТЫ ГАВОРАЦЬ АДКРЫТА АБ СВАІХ ПЛЯНАХ

ТОКІО. (Ул. інф. «Правды»). Фашысцкая «Ніхон» друкуе далей сэрыю антысавецкіх артыкулаў свайго спэца па пытаньнях інтэрвэнцыі — Камаіці.

«Недарэчна думаць, — піша гэты падгалосак авантурніцкіх колаў Токіё, —што паколькі СССР не праяўляе адзнакаў варожасьці ў адносінах да Японіі, трэба паспрабаваць вырашыць манчжурскую праблему ў супрацоўніцтве з СССР».

Камаіці перасьцерагае Кітай ад «памылкі», якую апошні можа дапусьціць, адмаўшы дыплёматычныя адносіны з СССР.

Наглядныя правакацыйныя выпады супроць СССР дазваляе сабе таксама газэта «Бусю Сіньпо», якая надрукавала два артыкулы нейкага Акада Мукіё пад загалоўкам «Няўхільнасьць японска-савецкай вайны», з падзагалоўкам «Больш выгадна ваяваць хутчэй».

«У даны момант,—піша аўтар,—у Азіі стварэцца крыніца найвялікшых хваляваньняў, згушчаюцца цяжкія хмары... Азія — гэта вышыні ўсяго сьвету, той, хто ўладае імі, пераможа. Барацьба за гэтыя вышыні пачынаецца з першага этапу — барацьбы за Манчжурыю і Манголію».

Паўтарыўшы гэтым адзін з тэзісаў вядомага мэмарандуму Танакі, аўтар указвае, што на шляху аб'яднаньня Японіі і Манчжурыі стаяць ПАЗШ і Расія, вайна з якімі няўхільна.

«Гаворачы аб няўхільнасьці вайны Амэрыкі з Японіяй, я хачу сказаць, што чым гэта хутчэй здарыцца, тым гэта будзе выгадней. Вайна з Расіяй будзе таксама тым выгодней, чым яна хутчэй пачнецца. Да таго часу, пакуль СССР ня скончыў свайго пяцігавага пляну, выгадней вырашаць, хто мацней».

Наконт прычын да вайны, аўтар таксама не сароміцца. Ён піша:

«Могуць спытацца — пад якімі прычынамі распачаць вайну? Гэта не прадстаўляе сабой ніякіх труднасьцяй. Можна даручыць гэту справу белагвардзейцам...

Прынамсі адкрыта!

ЗАКРЫЦЬЦЁ ЧЫРВОНЫХ ПРАФСАЮЗАЎ У ПРАЗЕ

ПРАГА, 11. Сёньня ў памяшканьне чырвоных чэха-славацкіх рэвалюцыйных прафсаюзаў зьявіўся паліцэйскі камісар у суправаджэньні значнага паліцэйскага атраду і абвясьціў распараджэньне праскага паліцэйскага кіраўніцтва, згодна якога **цэнтральны камітэт чырвоных прафсаюзаў і праская рада чырвоных прафсаюзаў абвяшчаюцца распушчанымі.** Роспуск матывуецца «парушэньнем закону аб таварыствах». Паліцыя зрабіла вобыск, канфіскавала ўсе справы і пячаткі абедзьвюх арганізацый.

Агляд сіл фашысцкіх арганізацый у Польшчы

ВАРШАВА, 11. У Пазнані адбыўся 15-пітысячны зьлёт членаў ваеннай арганізацыі «Стралец», які прайшоў пад знакам антыгерманскай прапаганды.

У зьлёце прымала ўдзел вялікая колькасьць былых афіцэраў. Пасьля ваеннага парада адбыўся мітынг, на якім кіраўнікі «Стральца» выступілі з шавіністычнымі антыгерманскімі прамовамі. Капітан Орліч у сваёй прамове між іншым заявіў: «мы, стралкі, заяўляем усім прыхільнікам перагляду граніц, што мы ня толькі гатовы да абароны, але памятаем таксама аб мільёнах нашых братоў, якія жывуць за нашай граніцай, і канстантуем, што дарога з Бэрліну у Пазнань тая-ж што і дарога з Пазнані ў Бэрлін».

Зьлёт сокалаў, які адбыўся ў Гдыні з удзелам 5 тыс. чал., у тым ліку сакольскай дэлегацыі з Чэха-Славакіі, Юга-Славіі і Амэрыкі, таксама меў характар антыгерманскай дэманстрацыі.

Антыгерманскую кампанію старанна патрымліваюць **лідэры сацыял-фашысцкіх прафсаюзаў,** не гаворачы ўжо аб адкрытых фашысцкіх прафсаюзах. Зьезд дэлегатаў ПСС-аўскіх і фашысцкіх прафсаюзаў гарнякоў і мэталістаў, які адбыўся 10 ліпеня ў Катовіцах, ухваліў рэзалюцыю, у якой гаворыцца, што «масавыя скарачэньні ў верхня-сілезкай прамысловасьці зьяўляюцца «простым рэзультатам варожых адносін германскай прамысловасьці да інтарэсаў польскай дзяржавы». Рэзалюцыя ўказвае на непарушнасьць польскіх тэрыторый і патрабуе безадкладнага высяленьня з Польшчы германскіх служачых і дырэктароў. Зьмест рэзалюцыі кідае сьвятло на мэтады польскага фашызму і сацыял-фашызму, які імкнецца накіраваць узрастаючае хваляваньне сярод рабочых мас у рэчышча антыгерманскага цкаваньня (ТАСС).

Прадвыбарчы тэрор у Румыніі

ВЕНА, 11. Паводле вестак з Бухарасту, «выбарчая барацьба» прымае ў Румыніі дзікія крывавыя формы. У ваколіцах **Фальтычэні** прыхільнікі фашысцкай антысэмітыкай лігі Кузы наладзілі **яўрэйскі пагром,** прычым шмат яўрэяў паранена і адзін забіты. Грызьня буржуазных партый паміж сабою выліваецца ў крывавыя пабоішчы. У горадзе **Бужау** паміж нацыянал-цараністамі і лібэралазі адбылася сутычка, у часе якой былі забіты член абшчыннай рады нацыянал-цараніст Баляжу і былыя сэнатары лібэралы Брадоану і Неагу.

Прадвыбарчы тэрор, накіраваны **выключна супроць рабоча-сялянскага блёку.** Па ўсіх прамысловых раёнах ахранка заняла судовыя памяшканьні, каб **перашкаджаць рэгістрацыі кандыдацкіх сьпісаў рабоча-сялянскага блёку.**

Асабліва моцныя прасьледваньні прыхільнікаў рабоча-сялянскага блёку ў Бэсарабіі, насельніцтва якой зусім стэрарызавана жандармэрыяй і фашысцкай «жалезнай гвардыяй».

АПОШНІЯ ВЕСТКІ З ФРОНТУ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

Пушчан апошні агрэгат агнятрывалага цэху Сталінску

СТАЛІНСК. 8 ліпеня ў агнятрывалым цэху Сталінскага мэталюргічнага заводу ўпяршыню дан газ у новую 22-камерную печ для абпальваньня дынасу. Такім чынам зараз працуюць усе печы цэху. Кожная камера новай печы зьмяшчае 60 тон (звыш 15 тыс. шт.) звычайнай цэглы. Канструкцыя печы дазваляе падтрымліваць у любой камеры рэжым абпальваньня. Да гэтага часу агнятрывалы цэх Кузьнецкбуду выраблялі толькі шамот. З пускам новай печы цэх будзе забясьпечваць завод і будаўніцтва дынасам. Памольна-фармовачнае аддзяленьне дынасавага аддзелу цэху абсталявана апаратурай навейшай канструкцыі.

Як харчовая прамысловасьць БССР выканала плян за першае паўгодзьдзе

Кандытэрска-мукамольныя вырабы

Менская фабрыка «Камунарка» паўгадавую вытворчую праграму выканала на 92,6 проц.; выпусьціла 5.060 тон прадукцыі.

Фабрыкай «Х-годзьдзе Кастрычніка» (Магілеў) выпушчана 1.336 тон прадукцыі — 100,8 проц. заданьня, «Чырвоны харчавік» (Бабруйск) — 1.495,4 тон — 114,9 проц., «Чырвоны мазыранін» (Нароўля) — 652,2 тоны — 79,1 проц.

Барысаўская фабрыка імя Леніна выпрацавала 3.634 тоны макарону, або 85,5% пляну за паўгода.

Завод імя Х-годзьдзя БССР (Талочын) выпрацаваў 278,3 тоны сухога крухмалу, што складае 33,9 проц. праграмы на паўгодзьдзе; завод «Чырвоны бераг» — 379 тон, або 45,2 проц. заданьня.

У сярэднім па Беларускім мукамольна-кандытэрскім аб'яднаньні паўгадавы плян выканан на 89,9 проц., што ў цэнпасным азначэньні складае 13.581 тыс. руб.

Маргарын

Новапабудаваны маргарынавы завод у Гомелі, які ўступіў у эксплёатацыю 25 чэрвеня г. г., за 6 пяцідзеўку чэрвеня выпусьціў 41 тону маргарыну, што дае 82% магутнасьці. Праектная магутнасьць аднэй зьмены роўна 10 тонам у суткі.

* * *

Менскі дражджавы завод «Чырвоная зара» даў за чэрвень 255,7 тон дражджэй, або 116,2 проц. месячнага заданьня; завод «Пралетары» — 36,4 тоны — 33,1 проц.; Віцебскі завод «Вызваленая праца» — 66 тон — 38,8 проц.

Агульны плян па дражджавой прамысловасьці за чэрвень выканан на 71,5 проц. Усімі заводамі выпушчана 358 тон дражджэй.

Завод «Беларусь» (Менск) за чэрвень месяц выпусьціў 5.501 гэкталітраў фруктовых вод, або 80,1 проц. месячнага пляну; Віцебскі завод імя Бэбеля — 2.644 г. л.—67,6 проц.; «Пралетары» (Магілеў)—1.827 г. л. — 76,1 проц.; «Спартак» (Ворша)—1.805 г. л. — 116,3 проц.

Агульны плян па вырабу фруктовых вод выканан на 79,9 проц.

Машынабудаўніцтва

Менскі машынабудаўнічы завод «Камунар» плян за чэрвень выканаў на 69,5%, выпусьціў прадукцыі на 279 тысяч руб. Зроблена 10 камнядрабілак, 7 солададрабілак, 180 бэтонных і 110 тачыльных варштатаў, 20 паваротна-поршневых помпаў, 50 кувырак і інш.

Лесаматар'ялы

Мэблевым цэхам камбінату «Камінтэрн» за 4 ліпеня зроблена 294 шт. мэблі, што дае 81,6 проц. дзённага заданьня і за 5 ліпеня — 102 шт. мэблі, або 26,5 проц. пляну.

* * *

Завод «Чырвоны Кастрычнік» за 6 ліпеня вырабіў 1,46 тоны будаўнічых цьвікоў, або 12,5 проц. праграмы на дзень.

Тэлефоны рэдакцыі: Адказны рэдактар—4-27; сакратарыят—10-74; сэктары: партыйнага будаўніцтва—13-80; эканамічна-прамысловы—13-80; каапэрацыі і снабжэньня—13-80; вайскова-палітычны—13-80; транспартны—6-19; сацыялістычнага земляробства—6-19; замежнай інфармацыі—6-19; сэктар ударных брыгад—6-19; лістоў рабочых і калгасьнікаў—6-19; культурнага будаўніцтва—6-19, агляду друку—6-19; бібліяграфія—6-